Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ВЕРАСЕНЬ 6 1933 г. СЕРАДА № 197 (4741) Год выданьня XVII

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СМАЛЕНСКІ РАЁН У СПАБОРНІЦТВЕ ЗАВАЁЎВАЕ ПЯРШЫНСТВА

(Па тэлеграфу)

Менск, РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА» — т. БРАГІНСКАМУ.

Смаленскі раён Заходняй вобласьці, спаборнічаючы з Менскім раёнам БССР 1-га верасьня **поўнасьцю выканаў плян засеву азімага жыта на плошчы ў 22.300 га.**

Сяўба працягваецца ў парадку выжанаўня сустрочнага пляну. Уборка збожжавых культур па раёну — 67,5 проц. 23 жніўня раён выканаў гадавы плян паставак збожжавых культур на 55,3 проц. Цераблельнае ільну на плошчы ў 6.622 га выкана-на поўнасьцю 27 жніўня. Плян загатовак малака трэцяга кварталу на 1-е верасьня выканан на 105 проц. 3-га верасьня фінплан III кварталу (1.902.000) выкапан на 100,3 проц., па ўкладах у ашчаджасу і пазыцы плян перавыкапан. Раён разгарнуў масавую папрыхтоўку да абласнога зьлёту перадавых сельсаветаў у барацьбе за добрую якасьць работ.

Сакратар Смаленскага гарадзкога і раённага камітэту партыі **М. ХАЎКІН.**

Дэлегатам першага Усебеларускага зьлёту калгасных конюхаў-ударнікаў—гарачае бальшавіцкае прывітаньне!

Увага і клопаты—калгаснаму каню

Заўтра адкрываецца першы ўсебеларускі зьлёт лепшых калгасных конюхаў-ударнікаў. Слова атрымліваюць перадавыя байцы за моцнага калгаснага каня, гаспадары калгаснай стайні.

«Конь, як і трактар — галоўная сіла ў калгасе, без якой калгас жыць ня можа».

Так заявілі ў сваёй адозьве да ўсіх сялян-калгаснікаў нашай рэспублікі дэлегаты першага ўсебеларускага зьезду калгаснікаў-ударнікаў. У гэтых простых словах—глыбокая праўда. Калгасны конь — таварыш трактару.

Ад таго, у чыіх руках калгасны конь, ад таго, як у калгасе беражуць каня, у першую чаргу залежаць даходы калгаснікаў, лёс калгасных ураджаяў.

Не выпадкова калгасная стайня стала арэнай абвостранай клясавай барацьбы. Сюды, на калгасную стайню кулак у першую чаргу працягнуў сваю шкодніцкую руку. І трэба яшчэ раз з усёй сілай падкрэсьліць, што далёка ня ўсюды сваячасова выкрылі гэты манаўр недабітага кулацкага ахвосьця.

Хіба сакрот, хіба ня факт, што мы маглі значна хутчэй, значна лепш скончыць сяўбу, калі-б лепш бераглі-б каня, лепш дагледалі яго, лепш, энэргічней змагаліся за ўмацаваньне конскага калгаснага пагалоўя.

Вазьмеце Мазыр. Маючы ўсе магчымасьці хутка і раней за іншыя раёны правесьці веснавую сяўбу, ён усё-ж гнебна зацягнуў пасеўную і скончыў сяўбу адным з апошніх. Ня дзіва. У раёне так недаацэнілі каня, не берагілі яго, невыстарчальна змагаліся з кулацкім шкодніцтвам на калгасных стайнях і ў выніку да пачатку і ў сярэдзіне сяўбы звыш 800 коняй было выведзена са строю.

Сёньня мы публікуем характэрнейшыя матар'ялы аб калгасе «Камінтэрн» з Дзяржынскага раёну. Урок гэтага калгасу — урок усім калгасам нашай рэспублікі.

Увесь час калгас цягнуўся ў хвасьце. І перш за ўсё таму, што ў калгасе на стайні пралез кулацкі шкодник. Кулакі беспакарана зьнішчалі лепшых племянных коняй, марылі іх голадам, калечылі, адным словам — зьнішчалі галоўную сілу калгасу — каня.

1 адсюль — дэзарганізацыя калгаснай вытворчасьці, гнебнае спазьненьне ня з веснавой сяўбой. Звыш паловы калгаснага пагалоўя кулак вывеў са строю.

Цяпер-жа калгаснікі с.-г. арцелі «Камінтэрн» з заслужаным гонарам заяўляюць, што іх коні — лепшыя коні ў раёне. І сапраўды. Калгасная конятарная фэрма гадуе племянных коняй, частка якіх зьяўляецца лепшымі не толькі ў раёне, але і ва ўсёй нашай рэспубліцы, і каштуе кожны такі конь многія тысячы рублёў. Фэрма становіцца сапраўдным «залатым фондам» калгасу.

Адкуль такое цуда. Хіба ня ў гэтым самым калгасе яшчэ толькі вясной большасьць коняй не маглі нават стаяць на нагах — да таго іх давёў кулак-шкодник. Нішкага цуду тут няма. Калгас над кіраўніцтвам партарганізацыі ўзяўся за рашучую ачыстку сваіх радоў ад кулацкага ахвосьця. На калгасную стайню прышоў сапраўдны ўдарнік, сумленны калгаснік.

Вось, напрыклад, тав. Зуеўскі. Ён адразу ўзяўся за справу. Ліквідаваў абязьлічку, увёў персанальную адказнасьць за кожнага калгаснага каня, разьбіў пагалоўе на групы. Кожны конь сваячасова накормлен, напоен, чысьціцца і ставіцца на адпачынак.

Усе коні, даверaныя т. Зуеўскаму, прыйшлі да ўборачнай у самым найлепшым стане і з посьпехам выкананалі ўборачныя нагрузкі.

Або вазьмеце калгаснікі т. Капановіч. Аб ёй у калгасе гаворыць, што яна дагледае за даверaным каўнём, як матка за дзецьмі. Лепшы атэстат калгаснікі.

Першы ўсебеларускі зьлёт калгасных конюхаў-ударнікаў павінен паложыць пачаткам сапраўднай, бальшавіцкай арганізаванай работы па ўмацаваньні і разьвіцьці конскага пагалоўя ў кожным раёне, саўгасе, МТС, калгасе, у кожнай працоўнай адпаасобнай гаспадарцы.

Наша рэспубліка адстае ў сацыялістычным спаборніцтве з Заходняй вобласьцю. Тэмпы, узятыя на пасеўным фронце цяпер не замацаваны. Заходняя вобласьць ідзе наперадзе. Параўнаем лічбы.

Па БССР на 30 жніўня: зжата збожжавых — 72,5 проц. і звезена — 63,3; выцераблена ільну — 63,6 і засеяна азімых — 10,5 проц. Гадавы плян па цьвёрдых збожжапастаўках выканан на 35,2 проц.

А вось паказальнікі Заходняй вобласьці. Зжата збожжавых — 78,3 і звезена — 78,2 проц. Лён выцераблен на 90,1 проц. і засеяна азімых — 52,8. Гадавы плян па збожжапастаўках выканан на 47,4 проц.

Нельга далей цярпець такога адставаньня! Усе намы сілы, усю нашу волю, усю нашу энэргію — на фронт уборкі, на фронт абмалоту і с.-г. паставак, на фронт сяўбы і зяблівага ворыва! Вышэй тэмпы і вышэй якасьць! Ні адзін колас не павінен застацца на полі, ні адзін гэктар азімага кліну не павінен пуставаць, ні адзін гэктар зяблівa не павінен застацца не ўораным.

Конь у выкананьні гэтых задач мае выключнае значэньне. Гэта-ж простая і элемэнтарнейшая ісьціна, якую, аднак, усё яшчэ не зразумелі многія раённыя арганізацыі.

Яшчэ не дабіта шкаднейшая недаацэнка каня, якая ліле ваду на млын кулацкага ахвосьця. Людзі сядзяць і чакаюць пакуль прыбудуць трактары, азімы клін пустуе, а налічныя коні на сяўбе не скарыстоўваюцца. Людзі чакаюць трактарных малатарань, а тут-жа пад бокам стаяць бяз усякага руху конныя малатарні. Такіх агіднейшых фактаў яшчэ нямала і асабліва ў Лагойскім і інш. раёнах. Хіба мала яшчэ фактаў, калі на стайнях арудуюць нявыкрытыя кулацкія элемэнты, калі абязьлічка выводзіць са строю конскае пагалоўе.

Нельга цярпець далей такога становішча. Конь мае выключнае значэньне ня толькі для справы пасьпяховага правядзеньня рашаючых работ у сельскай гаспадарцы—уборка, абмалот, пастаўкі, сяўба азімых, ворыва зяблівa, асваеньне цаліны.

Конь — гэта адзін з сур'ёзьнейшых і важных фактараў і ў рабоце нашай прамысловасьці, асабліва лясной, і ў справе абароназдольнасьці нашай краіны.

Дык за справу-ж, таварышы! «Калгасная стайня таксама вучастак клясавай барацьбы. Праверым склад конюхаў. Хто яны такія? Свой чалавек, ці клясавы ворат? Пакінем на гэтым вучастку найбольш праверaных і адданых калгаснай справе калгаснікаў-ударнікаў, выгнаўшы ўсіх разгільдзяяў і чужых людзей...». **(З адозвы першага зьезду калгаснікаў-ударнікаў).**

Дэлегаты зьлёту, лепшыя калгасныя конюхі-ўдарнікі павінны паказаць узор клясавай пільнасьці, пачінны разам з усімі сумленнымі калгаснікамі да каня і рашуча выкрыць кулацкае ахвосьце, выгнаць яго з калгаснай стайні, вывяць і вытнаць дапаможнікаў кулака—лодыраў, разгільдзяяў, прагулыгчыкаў.

Калгаснага каня—толькі надзейныя праверaныя рукі!

Партыйныя арганізацыі павінны апіраючыся на такую магутную сілу, як лепшыя калгасныя конюхі-ўдарнікі і перш за ўсё на дэлегатаў зьлёту так паставіць масава-палітычную работу ў кожнай брыгадзе, зьвяне, на стайні, каб кожны калгаснік дацэмся вяроў за сацыялістычную маемасьць, за калгаснага каня.

Трэба забясьпечыць кожнага каня адпаведнай колькасьцю высокакласных кармоў і добра падрыхтавацца да стойлавага перыяду. Трэба так арганізаваць догляд кожнага калгаснага каня, каб захаваць усё конскае пагалоўе ў самым лепшым стане да сяўбы яравых.

Камсамол—шэф калгаснага каня. Паасобныя ячэйкі паказваюць сапраўдныя ўзоры барацьбы за разьвіцьцё і захаваньне конскага пагалоўя. Але такіх узораў яшчэ мала. Зьлёт з поўным правам можа прад'явіць камсамольскім арганізацыям рахунак. Больш ініцыятыўнасьці, больш сапраўдных клопатаў, больш жывой мабілізуючай работы ў калгасных масах па ўразьвіцьці і захаваньні конскага пагалоўя.

Мабілізуючы масы вакол лёзунгу тав. **Сталіна** аб заможным жыцьці і бальшавіцкіх калгасах, вакол пастановы СНК і ЦК аб дапамозе бескароўным калгаснікам, вышэй узьняўшы сьцяг сацыялістычнага спаборніцтва, даб'ёмся перамогі на фронце ўборкі, малацьбы, паставак, сяўбы азімых і зяблівa.

Разьбіваючы антымэханізатарскія тэндэнцыі адначасова акружым кожнага калгаснага каня ўвагай і клопатамі!

Сваячасова разьлічыцца за работу МТС

АБ ХОДЗЕ ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ НАТУРАПЛАТЫ МТС

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

1. Бюро ЦК КП(б)Б адзначае, што ход выкананьня па БССР пляну натураплаты калгасамі за вытвараныя МТС у калгасах работы зьляўляецца вельмі нездавальняючым. Жнівеньскі плян натураплаты на 1-IX—33 г. выканан толькі на 37,1 проц., гадавы плян толькі на 10,2 проц. Гэта сьведчыць аб тым, што загатоўчыя арганізацыі, машынна-трактарныя станцыі, РК КП(б)Б яўна недаацэньваюць важнейшае палітычна-гаспадарчае значэньне сваячасовага, бязумоўнага і абавязковага ўнясеньня натуральнай аплаты МТС калгасамі.

Асабліва ганебна адстаюць па выкананьні пляну натураплаты — Барковіцкая МТС (11,6 проц. выкананьня жнівеньскага пляну), Расонская МТС (2,3 проц.), Сураская МТС (4,9 проц.), Лепельская МТС (5,1 проц.), Дрысенская МТС (11,3 проц.), Ветрынская МТС (11,5 проц.), Плешчаніцкая МТС (21,9 проц.).

2. Бюро ЦК КП(б)Б адзначае наяўнасьць у радзе выпадкаў парушэньня пастановы партыі і ўраду, якое заключаецца ў незаконным запічэньні мясцовых загатоўчымі арганізацыямі здаваемага калгасамі ў лік натураплаты МТС збожжа ў фонд абавязковай збожжаздачы дзяржаве і ў адмове прымаць натураплату ад паасобных калгасаў да поўнага заканчэньня імі збожжапаставак.

Улаўнаважаны загатовак Мсьціслаўскага раёну Рабцаў залічыў натураплату ў лік абавязковых збожжапаставак. Такія-ж факты кулацкага супраціўленьня натураплаце і мелі месца ў рабоце Загатэрне Слуцкага, Лёзьнянскага, Аршанскага і іншых раёнаў. Гэтыя факты зьяўляюцца рэзультатам таго, што цэлы рад кіруючых раённых арганізацый і МТС, прыстасоўваючы практыку «чарговасьці», у пагоні за «звышвыкананьнем» пляну збожжаздачы па сутнасьці ігнаруюць выкананьне пляну натураплаты і не зразумелі, што за гэтым ігнараваньнем крыецца кулацкае супраціўленьне ўзмацняючаму ся ўплыву МТС.

Бюро ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Прапанаваць усім РК КП(б)Б, дырэктарам і начпалітаддзелаў МТС неадкладна дабіцца рашучага пералому ў справе выкананьня пляну натураплаты, мабілізуючы вакол гэтага шырокія масы калгаснікаў і прыцягваючы да суровай партыйнай і судовай адказнасьці асоб, парушаючых і зрываючых пастановы партыі і ўраду.

2. За зусім нездавальняючае выкананьне жнівеньскага пляну натураплаты абвясьціць вымову дырэктарам Барковіцкай МТС — тав. ЧЫКУНОВУ, Расонскай МТС — т. ГАНЧАРЭНКА, Лепельскай МТС — т. ВАСІЛЬЛЕВУ, Ветрынскай МТС — т. ШКУРДЗЭ, Плешчаніцкай МТС т. МІХАЙЛАВУ. Прапанаваць начпалітаддзелаў і дырэктарам гэтых МТС у бліжэйшыя дні прыняць усе меры да таго, каб быў дасягнут пералом у справе выкананьня пляну натураплаты.

3. Прапанаваць тав. САКАЯНУ прыцягнуць да суровай адказнасьці ўлаўнаважанага па загатоўках па Мсьціслаўскім раёне РАБЦАВА, загадчыкаў Загатэрне Лагойскага, Слуцкага, Лёзьнянскага і Аршанскага раёнаў.

4. Прапанаваць прамурору рэспублікі тав. КУЗЬМІНУ прыцягваць да крымінальнай адказнасьці за парушэньне пастаноў партыі і ўраду аб аплаце натурай работ, вытвараных МТС па дагаворам з калгасамі.

5. У сувязі з тым, што маюць месца паасобныя факты скажэньняў у справе ўзіманьня натураплаты (незаконнае ўзіманьне натураплаты за непрaароблену работу і г. д.), даручыць ЦКК і палітсэктару МТС НКЗБ правесьці ў радзе МТС праверку парадку і практыкі ўзіманьня натураплаты.

ЧАПЯЛЁЎ
СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ „ПЕРАМОГА"
НЕ 0,08, А 0,15

Пасьля таго, як мы з нашага калгасу вычысьцілі кулацкія гаспадаркі, работа пайшла іншым, дружнейшым. Да 27 ліпеня скончылі касьбу, па-баявому падрыхтаваліся да жніва. У першых числах жніўня пачалі жаць, да 10 жніўня ўбралі азімыя, да 20-га — звезьлі ў пуні. Адразу-ж мы прыступілі да абмалоту.

17 жніўня калгас разьлічыўся з дзяржавай. Здалі мы дзяржаве жыта без аднаго процанту вільготнасьці і засьмечанасьці.

Скончылі ўборку ільну. У цэнтры ўвагі была пастаўлена барацьба за высокую якасьць уборкі, барацьба са стратамі. Ні аднаго коласа не пакінулі на полі. Два вартаўнікі ахоўвалі наш ураджай. Акрамя таго, на ахову ўраджаю былі мабілізаваны дзеці.

22 жніўня была распачата зяблеўня сяўба. Мы паставілі перад сабой задачу дабіцца ў 1934 г. яшчэ вышэйшага ўраджаю, чым сёлета, а сёлета мы дабіліся ўраджаю ў 12 цэнтнэраў жыта з гэктара.

Лёзунг — не здаваць пярэдніцтва ў спаборніцтве, заваяванага намі ў часе пасеўнай кампаніі — стаў блізкім кожнаму калгаснику.

На нашых палёх разгарнулася спаборніцтва і ўдарніцтва. Мы прэміравалі 8 лепшых ударнікаў. Асабліва добрыя ўзоры барацьбы за пярэдніцтва паказалі жанчыны. Пры цераблёньні ільну, замест нормы ў 0,08 га калгасьніцы Сукайлава Мар'я, Чапялёва Мар'я, Рабкова Каня выпрацоўвалі па 0,15 га.

Дубровенскі раён.

МЭТАНІС
СТАРШЫНЯ КАМУНЫ „ЧЫРВ. ПАЛЯНА"
На шляху да заможнага жыцьця

Наша камуна **«ЧЫРВОНАЯ ПАЛЯНА»** спаборнічае з калгасам «Чырвонаармеец». У часе веснавой сяўбы і ўборкі азімых калгас **«ЧЫРВОНААРМЕЕЦ»** абганяў нас у тэмпах. Мы ўпарта змагаліся, не здавалі пазыцый. У выніку напружанай барацьбы пад кіраўніцтвам і пры актыўнай дапамозе арганізаванай кандыдацкай групы мы адваявалі пярэдніцтва ў калгаса «Чырвонаармеец» і заняли першае месца ў сельсавеце па ўборцы і здачы прадукцыі дзяржаве.

Дабіліся мы значнага павышэньня ўраджайнасьці. У гэтым годзе атрымалі 12,2 цэнтн. жыта з га. Камуна сёлета зрабіла буйны крок па шляху да заможнага жыцьця. На працадзень у нас прыпадае пяць з паловай кілё збожжавых культур.

І гэта не выпадкова. Нашы камунараўцы па-ўдарнаму змагаліся за высокі ўраджай. Сенажаць, канюшыну скасілі і ўбралі да 17 ліпеня. Уборка жыта з 31-га пачалі 1 жніўня, скончылі 7-га. Ні аднаго зерня не пакінулі на полі. Да 20 жніўня поўнасьцю абмалацілі жыта. Мы вымалочвалі за дзень 11 з паловай тон, замест устаноўленай нормы ў 9 тон. З дзяржавай мы разьлічыліся 13-га жніўня па 100 проц. Упеслі натураплату МТС.

Зараз мы кінулі ўсе сілы на завяршэньне ўборкі яравых, цераблельне ільну. Адначасова з цераблеьнем арганізавам абмалот і расьціл ільну. Дзяржаве будзе здана ільнавалакно ня пазьней 12-га пумару.

Першымі ў раёне мы прыступілі да сяўбы. Скончым сяўбу раней тэрміну на два дні. Сеем на 75 проц. радковымі сеялкамі.

Лепшыя камунары - ўдарнікі — **МІКАЛАЕЎ РЫГОР, БАЛДЗЭСАЎ РЫГОР, ШКУРАТАЎ УЛАДЗІМЕР, ВІШНЕЎСКІЯ ІГНАТ і ВІНЦЭСЬ** замест нормы ў 0,5 га ў дзень узорваюць 0,82.

З лодырамі мы праводзім жорсткую барацьбу. Такія лодыры, як **ТРОПАЎ МІХАСЬ, ДРАЗДОЎ ПАРФЕН і ЛЯХАЎ КАНДРАТ,** якія ў дзень выпрацоўваюць 0,9 га і дрэнна дагледваюць коняй, атрымалі па заслугах.

Мы праверылі сацдагавор і пераканаліся, што ў нас ёсьць пямала посьпехаў, але ёсьць і недахопы. Зараз мы накіроўваем усю ўвагу на ліквідацыю недахопаў і ўпарта змагаемся за заваяваньне пярэдніцтва.

Дубровенскі раён.

М. І. КАЛІНІН У СМАЛЕНСКУ

Усесаюзны стараста запрошан у БССР

СМАЛЕНСК, 5. (Па тэлеграфу ад нашага спэц. кар-та).

Смаленск урачыста сустракае ўсесаюзнага старасту МІХАІЛА ІВАНАВІЧА КАЛІНІНА. Ужо вечарам 4 верасьня, калі вуліцы запаліся электрычным агнём, горад прыняў сьвяточны выгляд. На кожным доме, у вітрынах, на пляцох і на вакзале — чырвоныя сьцягі, прывітаньні, пёзунгі, плякаты, партрэты Міхаіла Іванавіча побач з партрэтамі правадыра партыі тав. СТАЛІНА і яго вярнейшых паплечнікаў—т. т. МОЛАТАВА, ВАРАШЫЛАВА, КАГАНОВІЧА.

Днём 4-га і ноччу 5 верасьня з усіх канцоў вобласьці па розных кірунках і розьнымі шляхамі сьцягваюцца ў Смаленск старшыні перадавых сельсаветаў, дэлегаты першага абласнога зьезду перадавых сельсаветаў.

Шмат іх, дэлегатаў: з 2.700 сельсаветаў вобласьці прыбывае 1.700 дэлегатаў. Гэта ўсё перадавікі, заваёвавушыя права пасылкі дэлегатаў на зьлёт. Мандаты на зьезд заваяваны ў напружанай барацьбе за сваячасовае і датэрміновае заканчэньне палітычна-гаспадарчых кампаній. Посьпехі вобласьці ў цэлым далі права перадавікам запрасіць на абласны зьлёт Міхаіла Іванавіча Калініна і апрымаць яго згоду на прыезд.

Раніцу 5 верасьня — дзень прыезду Міхаіла Іванавіча — Смаленск сустракаў нязвычайным ажыўленьнем. У 7 гадзін раніцы на вуліцах заварушыліся калёны. Рабочыя і калгасныя масы, вайсковыя часьці і школьнікі арганізаванымі радамі выйшлі спаткаць усесаюзнага старасту. У 9 гадзін на цэнтральных вуліцах, пачынаючы з Малахоўскіх варот і канчаючы вакзалам, — поўна народу. Чым бліжэй да станцыі, тым гусьцей масы арганізаваных калён працоўных. Вось і час прыбыцьця цягніка. Сьціхаюць гапасы... Грымяць аркестры, нясецца ўшыр і ўвысь гучнае «ура».

Тав. Калінін, бадзёры і жыцьцярадасны паказваецца на пляцформе. «Ура, ура, ура» — сустракаюць госьця тысячныя гапосы.

Тав. Калінін ідзе ўсьцяж радоў гарадовай варты, рабочых мас, дэлегацый ад сельсаветаў, іншых краёў і рэспублік, што прыехалі на зьлёт. Прымае парад вайсковых часьцей, якія праходзяць перад ім цэрэманіяльным маршам.

ТАВ. КАЛІНІН узыходзіць на трыбуну, што тут-жа, на вакзале пабудавана. Старшыня гарсавету тав. ПЛЮСЬНІН адкрывае мітынг. Коратка і горача вітае госьця. І зноў у гучным і працяжным «ура» перадаюць масы свой радасны прывітаньне Міхаілу Іванавічу — доўгалетняму ўсесаюзнаму старасьце.

— СЛОВА ПРАДАСТАЎЛЯЕЦЦА ТАВ. КАЛІНІНУ. Ён гаворыць ад тым як пад кіраўніцтвам кампартыі на чале з тав. СТАЛІНЫМ расьце і ўмацоўваецца Савецкі Саюз, аб тым, як нязьмерна хутка росьце добрабыт працоўных мас, аб тым, што гапоўнае ў гэтым росьце сацыялістычнага будаўніцтва СССР — гэта пералом у калгасным будаўніцтве, у рэзкім паляпшэньні работы калгасаў і жыцьця калгаснікаў. Гэты пералом прыметны і ў Заходняй вобласьці. Заходняя вобласьць не на апошнім месцы ў радох працоўных у спаборніцтве абласьцей, краёў і рэспублік.

Мітынг на вакзале скончан.

Тав. Калінін едзе ў горад у суправаджэньні кіраўніцкіх абласных арганізацый.

У 5 гадзін вечара пачынаецца работа зьлёту. На гэтым зьлёце выступіць тав. КАЛІНІН.

УСЕСАЮЗНАМУ СТАРАСЬЦЕ ПАСЛАНА ЗАПРАШЭНЬНЕ ПРЫЕХАЦЬ У БССР.

Крычаў датэрмінова выканаў жнівеньскі і верасьнёўскі пляны збожжапаставак

Менск, ЦК КП(б)Б—тав. **ГІКАЛО**
Старшыні СНК БССР—тав. **ГАЛАДЗЕДУ**
Рэдакцыі газэты **„ЗЬВЯЗДА"**

На аснове масавай работы пад непасрэдным кіраўніцтвам ПК па чале з тав. **Гікало** Крычаўскі раён датэрмінова 2 верасьня выканаў жнівеньскі і верасьнёўскі пляны абавязковых паставак збожжа на 100,7 проц. Заданьне — 9.205 цэнтнэраў — выканана ў 9.235 цэнтнэраў. Мясазагатоўкі III кварталу — 1 верасьня 111 проц. Змагаемся за якаснае скончэньне ў бліжэйшыя дні ўборкі, пасеву азімых, датэрміновае завяршэньне збожжаздачы, уняесьня натураплаты МТС.

Райком — ВОЙТАЎ.
РВК — ВАРАБ'ЕЎ.
Камзаг. — ЛУШКОЎ.

УЗАЕМНАЯ ПРАВЕРКА

— Дзе лепш?

Гэтым пытаньнем сустракалі амаль у кожным калгасе аб'ядналую камісію Уваравіцкага і Б.-Кашалеўскага раёнаў па праверцы міжраённага сацыялістычнага дагавору.

Уваравіцкі і Б.-Кашалеўскі раёны заключылі паміж сабой сацыялістычны дагавор на лепшае і сваячасовае правядзеньне ўборкі, абмалоту і паставак збожжа і іншых с.-г. прадуктаў дзяржаве, а таксама на сваячасовае і высокакласнае правядзеньне сяўбы азімых.

РАЁН ПРАВЯРАЕ РАЁН, КАЛГАС—КАЛГАС

Цяпер надышоў час праверкі першых вынікаў сацыялістычнага дагавору. Раён правярае раён. Калгас правярае калгас.

Ва Ўваравіцкі раён прыбылі для праверкі лепшыя перадавыя калгаснікі і прадстаўнікі партыйна-савецкіх арганізацый Б.-Кашалеўскага раёну. Да іх Уваравіцкі раён з свайго боку вылучыў лепшых калгаснікаў-ударнікаў, і аб'яднаная камісія прыступіла да масавай праверкі выкананьня сацыялістычнага дагавору ў калгасе.

Да 1-га верасьня аб'яднаная камісія праверыла 12 калгасаў Уваравіцкага раёну. Аб чым гаворыць папярэдняя вынікі праверкі.

Рэзка адчуваецца куды лепшая арганізаванасьць, куды лепшая якасьць работы параўнальна з мінулым годам. Лёзунг сацыялістычнага спаборніцтва знайшоў гарачы водгук у калгасных масах.

І **АСАБЛІВУЮ СІЛУ** гэты новы зрух у сьвядомасьці калгасных мас, у іх адносінах да калгаснай працы набыў пасьля лёзунгу тав. **СТАЛІНА** аб новым, заможным жыцьці і барацьбе за бальшавіцкія калгасы.

Апошняя пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб дапамозе бескароўным калгаснікам круга ўзьняла зацікаўленасьць калгасных мас у лепшай арганізацыі калгаснай вытвор часьці, у лепшым правядзеньні ўборкі і паставак збожжа.

У мінулым годзе ў дзень 28 жніўня—дзень так званай «прачыстай»—у раёне назіраўся амаль пагалоўны нявыхад калгаснікаў на работу.

Зусім іншая справа цяпер. У дванаццаці калгасах, дзе працавала аб'яднаная камісія па праверцы выкананьня сацыялістычнага дагавору, усе калгаснікі як адзін дружна працавалі на палёх. Толькі ў адным калгасе раёну—у калгасе «Вольная праца»—мелі месца прагулы.

ПРАЦУЕМ ДРУЖНА, АРГАНІЗАВАНА

Але гэты факт—выключэньне. Перадавыя калгаснікі сваім асабістым прыкладам дабіваюцца рашучага ўзмацненьня працоўнай дысцыпліны. У калгасах «Чырвоны шлях», «Ударнік пяцігодкі», імя Варашылава (коль касьць такіх калгасаў можна памножыць) працуюць дружна ад цямна да цямна.

Няма такога калгасу (з ліку 12 праверaных калгасаў) дзе-б ня былі арганізаваны начныя работы на ўборцы і малацьбе.

Красамоўнай ілюстрацыяй росту сьвядомасьці калгасных мас можа служыць с.-г. арцель «Ударнік пяцігодкі», Чабатовіцкага сельсавету. З самага пачатку ўборкі ў калгасе не было ні аднаго прагулу, ні аднаго спазьненьня на няўважлівых прычынах.

Калгаснікі як правіла перавыконваюць нормы выпрацоўкі. А гэты-ж самы калгас яшчэ летась цягнуўся ў ганебным хвасьце і не злазіў з чорнай дошкі.

Цяпер пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі і новага старшыні праўленьня калгас упэўнена выходзіць на перадавыя пазыцыі.

Усе збожжавыя культуры ўборны і звезены. Калгас ужо выканаў свае абавязацельствы па збожжапастаўках. На адзін працадзень у калгасе прыпадае па 4 кілё збожжавых і па 10 кілё бульбы.

А зараз «Ударнік пяцігодкі» ўзяў на сацыялістычны буксір суседні калгас «Палеская праўда», які адстаў ва ўборцы, малацьбе і пастаўках.

КАМІСІЯ НА ПРЫЁМЦЫ ПАЛЁЎ

Зварачвае на сябе ўвагу каштоўнейшы вопыт перадавых калгасаў раёну ў барацьбе супроць страт.

Калгасы адзін за адным пачынаюць шырока практыкаваць прыёмку ўбраных палёў ад кожнай вытворчай брыгады і ўнутры брыгад ад кожнага зьвяна.

За страты нясе матар'яльную адказнасьць тая брыгада, зьвяно, якія іх дапусьцілі.

Вось вытрымка з акту камісіі па прыёмцы поля, з якога быў убран ячмень, у калгасе **«ЧЫРВОНЫ ШЛЯХ».**

«Па брыгадах №№ 2, 3, 7 дапушчаны страты ў 0,8 цэнтнэра на кожны гэктар. Камісія прапануе залічыць гэтыя страты на калгаснікаў брыгад, якія працавалі па касьбе і ўборцы ячменю».

І ВЫНІКІ ІХ РАБОТЫ

Прапанову камісіі абмеркавала праўленьне калгасу, а потым і на агульных сходах брыгад. Калгаснікі прызналі сваю памылку і згадзіліся з прапановай камісіі.

Практычныя вынікі гэтага мерапрыемства далі сябе неадкладна адчуць. Якасьць уборкі рэзка **ПАЛЕП ШЫЛАСЯ.** Калгаснікі пачалі на справе змагацца супроць страт.

Вось, напрыклад, што выйшла ў калгасе з аўсом. Авёс скасілі, а тут дажджы. Калгаснікі ўсьлед за касьбой паставілі ўвесь скошаны авёс у кучкі з павяжай вярхоў і адлогай расстаноўкай камлёў. Пры такой пастаноўцы ня гледзячы на тое, што авёс папаў пад дождж і стаіць ужо доўгі час на полі, ён нікольні не псуецца і не чарнее. Дзень пагоды—і авёс можна звазіць, не дапусьціўшы ніякіх страт.

Але камісія выкрыла і цэлы рад агідпейшых недахопаў якіх нельга далей цярпець ні аднэй мінуты. Вось, напрыклад, калгас **«ПЕРША-МАЙСК»,** Івольскага сельсавету. Тут скасілі 60 гэктараў аўса і пакінулі яго абяяк на полі. У кучкі авёс не пастаўлен і ў выніку 26 гэктараў аўса ўжо пачарнелі і пачынаюць прарастаць.

Толькі 29 жніўня праўленьне узялася за зрабаньне каласоў. Дый то толькі таму, што даведалася аб прыезьдзе аб'яднанай камісіі па праверцы выкананьня сацыялістычнага дагавору.

ЯК УЗАКОНЬВАЮЦЦА СТРАТЫ

У цэлым радзе калгасаў, напрыклад, у калгасах імя Леніна, імя Калініна (№ 2), «Новы сьвет» і «Авангард» вельмі **ДРЭННА** арганізаван аб малот. Пры абмалоце ў гэтых калгасах у саломе астаецца ад 15 да 25 проц. збожжа.

У калгасе «Авангард» у жытняй саломе пасьля малацьбы астаецца да 20 проц. збожжа. Камісія прапанавала старшыні калгасу Смалярову правесьці паўторны абмалот. Смалярэў у адказ заявіў:

«Навошта? Перамалачваць ня трэба, бо мы і так памалацілі столькі, колькі вызначана ў нашых наметках пры ўстанаўленьні ўраджайнасьці з аднаго гэктара».

Гэты фармальна—бюракратычны адказ азначае адкрытае ўзаконьваньне страт. Раённыя арганізацыі і ўвесь калгасны актыў павінны рашуча змагацца з такімі фактамі і правільна арганізаваць малацьбу.

Нельга дапусьціць, каб хоць грам збожжа заставаўся ў саломе пасьля малацьбы. Ва ўсіх калгасах, дзе выяўлен значны адыход збожжа ў салому, павінен быць праведзен, і пры тым неадкладна, паўторны абмалот і пасьля малацьбы ўшыр і ўвысь гучнае «ура».

Зварачвае на сябе ўвагу і яшчэ адна акалічнасьць. Гутарка ідзе пра паасобныя спробы нарміць масава-растлумачальную работу адміністраваньнем. На такі шлях стала праўленьне калгасу імя **БУДЗЁННАГА.** Яно практыкуе масавыя штрафы, але не праводзіць ніякай растлумачальнай работы, ігнаруе сацыялістычнае спаборніцтва.

Партыйная арганізацыя павінна за цікавіцца калгасам імя Будзённага, праверыць што за людзі сядзяць у праўленьні калгасу, забясьпечыць разгортваньне ў гэтым калгасе сапраўднай масава-растлумачальнай работы.

ЗАМАЦАВАЦЬ ПЕРШЫ ЗРУХ

Вопыт міжраённай праверкі выкананьня абавязацельстваў, узятых па сацыялістычным спаборніцтве заслугоўвае самага пыркога перанясеньня ў іншыя раёны і калгасы.

Аб'яднаная праверачная камісія за першыя восем дзён работы дапамагла раённым арганізацыям і самім калгасам выявіць вопыт лепшых перадавых калгасаў і выкрыць слабыя месцы, выкрыць дапушчаныя недахопы і памылкі ва ўборцы і пастаўцы збожжа.

На гэтых днях у адным з калгасаў Уваравіцкага раёну, на мяжы з Буда-Кашалеўскім раёнам, праводзіцца аб'яднанае пасяджэньне Уваравіцкага і Б.-Кашалеўскага райкомаў партыі і райвыканкомаў з удзелам пыркога калгаснага актыву.

На пасяджэньні будуць падагулены вынікі праверкі выкананьня сацыялістычнага дагавору ў калгасах Уваравіцкага раёну і вызначаны далейшыя задачы. А затым чарга за Б.-Кашалеўскім раёнам за праверкай таго, як калгасы выконваюць узятыя на сябе абавязацельствы.

Раённыя партыйныя арганізацыі павінны ўзмацарыстаць гэты каштоўны вопыт масавай работы для рашучага ўдыму і тэмпаў і якасьці ўборкі, абмалоту і паставак збожжа, сяўбы азімых і зяблівa!

Я. Ів.

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЛЁТ

КОНЬ НЯСЕ ВЯЛІКУЮ СЛУЖБУ НА ПАЛЕХ, КОНЬ ВЕРНЫ

ПРАВІЛЫ АЛЯКСЕЯ ГАРБАЦЭВІЧА

Яшчэ з вясны навісла сьвінцовая атмасфэра сямейнай бязладзіцы ў Аляксея Гарбацэвіча. Наступіла бязмоўная, з надворку спакойная, настарожана скрытая цішыня ў хаце. Але ўзарвалася гэта цішыня амаль разам з разлівам разбухшай Сьвіслачы, раней ціхай і мелкаводнай. Як і Сьвіслач, якая была здольна ў гэтым годзе пагражаць Дукорскаму масту сваёй шумнай, каламутнай і моцнай вадой, так і ціхая жонка Аляксея гатова была па рокі і нават нязвычайны для яе крок.

Або я, або Маньки! Выбірай адно з двух!

Справа зьвязана з зайздрасьцю. Тут пагражала разрывам. І калі прычына разліву Сьвіслачы — нечаканая цёплая, сопечная вясна і хутка таючы сьнег, то ў Аляксея яна складаней і бярэ свой пачатак са студзеньскіх марозаў... . . . . .

... Лабусову і Каляндзе ўжо больш не даваяюць. Конюхаў Лабусава і Каляду выкінулі з калгасу імя ЦВК. Кулакі, былыя людзі ня маюць права быць гаспадарамі калгаснага табуну. І тады, сход да позьняй ночы абмяркоўваў каму — калгаснае давер'е, каму—юст гаспадара стайні.

Малады калгасьнік Аляксей Гарбацэвіч слядзеў у задніх радох. У цені шырокай сьпіны ўнерадзе садзяўшага калгасьніка Аляксей апраўляўся ад пялёўкасьці, як-бы саромячыся, калі гаварылі аб ім:

— Малады, гэта праўда, малады ён... але старанны ўдарнік.

А другі:

— Аляксею даверыць можна. Аляксей ды Гула Іван — слаўная пара. Ім ня то што коняй, ім золата даверыць можна!

Былі і такія размовы.

— Што золата? Коні нам даражэй золата! Коні — гэта наша сіла... А Аляксею ўсё-ж даверыць можна.

Наступнай раніцой Аляксей Гарбацэвіч стаяў паміж стойлаў стайні № 1, усхвалявана пагладжваў цёплыя крупы коняй, потым бег у другую стайню і тут доўга стаяў, глыбока ўдыхаючы цёплы пах конскага поту.

Новае пачуцьцё, дагэтуль невядомае яму, аўладала Аляксеем. Нешта падобнае па лёгкі жах, трапятлівую радасьць. Гэта пачуцьцё бывае і ў шофэра, якому ўпершыню даверылі машыну, у вагонаважатага ў першых рэйсах. Гэта тая-ж аратарская ліхаманка першых выступленьняў перад вялікім сходам. Гэта ўсё разам узятае. Гэта пачуцьцё адказнасьці.

***

Праз месяц пасьля таго, як Аляксею даверылі калгасны табун, скончыўся першы ўсесаюзны зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў. Тады кіраўнікі партыі і Чырвонай арміі гаварылі аб кані і конюхах.

— Сёньня аб табе ў газэтах, — гаварылі Аляксею.

І сапраўды, старэйшы конюх калгасу імя ЦВК Аляксей Гарбацэвіч адчуваў, што гаварылі для яго, аб ім, калі ён чытаў: т. **Кагановіч: «Конюхы з вас ведае, што значыць догляд за канём. Вы добра водаеце, што карміць коняй — гэта ня проста наваліць сена і саломы. Важна — калі наваліць, як наваліць, якую салому, ці ўзяць яе на сечку, палову — мякіну папарыць, прытрымаць канцэнтраваныя кармы да вясны, а зараз карміць іншымі і г. д.».**

... Аляксей уважвае карысы, ведае каму «як і колькі наваліць». Колькі «Гняздому», колькі «Маліне», колькі «Сокалу», «Цаплі»...

ВАРАШЫЛАЎ: «Успомніце, як калісьці бядняк і серадняк марылі, як аб найвялікшым шчасьці,— аб кані. — Эх! Каб мне ды каняку,—гаварылі беднякі-ўкраінцы; эх! каб мне ды каняку,—гаварылі безлашаднікі - масквічы, рязанцы, пензьнякі і г. д. І калі, нарэшце, гэты конік прышоў да вас, калі вы сталі яго гаспадарамі, вы не ўзялі яго пад сваю ахову, пад свой нагляд, пад сваю абарону».

... І Аляксей успомніў, як калгасьнік з брыгады аратых ускач, галопам тнаў калгасную кабылу па бравурчатай вуліцы вёскі, як сьвісьцела пуга, і як не вытрымаўшы Аляксей крыкнуў:

— Ня бі кабылу...

Хто бачыў, як Аляксей выводзіў «Сокала»? Жарабец рэзка гарцаваў, наравіў уздыбіцца. Доўгая ўзьдзечка ў руках Аляксея ўстрымлівала беспакойнага «Сокала». З якой гордасьцю праскакваў Аляксей на «Сокале» да рочкі, з якой любоўю ён купае і чысьціць «Сокала»...

А ў прыняцьці ад Лабусава і Каляды стайнях Аляксей адразу-ж наводзіў парадкі. Ён перарабіў сьценкі стойлаў, загнаў дошкі ў бляшкі (каб нічога вострага) і зараз у стайні няма ніводнага цьвіка ні ў кармушках, ні ў бляшках, ні ў сьценках стойлаў...

БУДЗЁННЫ: «Ці не вядомы вам такія факты, калі калгасьнік адзявае хамут, і абавязкова наадварот, або зробіць так, што адна аглобля павернута наперад, а другая назад; дугу абавязкова адзене наўкос і так сядзіць і едзе, нават па Маскве так едуць. І хоць-бы што! Хамут б'е па каленях, тым самым наносячы каню шкоду, зношваецца конскае пагалоўе».

... У Аляксея 19 кабыліц, 4 кані, 1 жарабец, 6 жаробкаў. І за час яго работы — ніводнай запарыны, ніводнай пашёртасьці. Аляксей перарабіў усе купленыя новыя хамуты. Кожнаму каню — свой хамут, свая збруя. Замяніць збрую ня могуць—яна зануморавана. Замяніць збрую — злачынства. Ніводзін калгасьнік не зробіць гэтага — «Аляксей вочы выесьць».

А вось кабыла «Беланожка» захварэла (было гэта за месяц-паўтара да таго як ажаробілася). Ветэрынарны доктар прызнаў запаленьне венчыка капытнага храшча. Два разы ў дзень, рэгулярна, Аляксей, нікому не давяраючы, робіць ёй сьпіртавыя кампрэсы.

І колькі разоў па шляху ў Рудзенск Аляксей супыняў сустрэчных калгасьнікаў з «Чырвонага партызану» і гаварыў:

— Паглядзі, як хамут падцяпнут, ён-жа як абруч вісіць. Ня псуй каня!

І часта: разьмінуўшыся па трасе калёсы; адна запрэжаная парай аднарослых, сытых, гладкіх быццам маслам змазаных коняй, а з другой фурманкі сядзе абавязкова запытае вазьніцу.

— Чые коні?

А вазьніца адкажа не задумваючыся:

— Мабыць з калгасу імя ЦВК.

ЗВАРОТ ЗЬЛЁТУ: «Конюх як і трактарыст — гэта самая гакаровая і адказная пасада ў калгасе. Зразумейце гэта! У каго ў руках калгасны конь — у таго ў руках і ўраджай вашых палёў і вашы даходы. Дык вазьмецеся-ж зараз-жа за праверку таго, наколькі надзейныя гэтыя рукі. А то ў нас каню-хамі часта зьяўляюцца ня тыя людзі, якія патрэбны нам. Глядзіш, быццам добры, сумленны, старанны хлапчук, да ці шкат у ім карысьці, калі ён толькі ўчора даведаўся з якога боку хамут на каня адзяецца».



... Ведае Аляксей «з якога боку хамут адзяецца», але ня ўсё ведае. Урве сьвайнку і за канікку. Аляксей ведае сёе-тое аб генэтыцы каня, разьбіраецца ў народах. Цяпер вядома, адрозьніць гаповерскага каня ад ютландскага,энгельскага ад арабскага. Пашарканы Оулта-Цройі, і Хрысьціян Брыдт — гэта яшчэ ня ўсё.

Праўда, ведае Аляксей, калі горкую соль даваць, як і колькі кабыле перад і пасьля жарабленьня выстойваць. Зараз аднаасобнікі за парадай да мала дога конюха прыходзяць, але гэта яшчэ ня ўсё.

— Вучыцца трэба — думае, але цяжкуль што не заікаецца Аляксей. Ведае—цяжка зараз калгасу без яго застацца.

А калі хочаце вымераць работу Аляксея па працаднёх, дык і тут арыфмэтыка не складаная — 275 працадзён за шэсьць месяцаў.

***

Вясна ў калгасе імя ЦВК была гарачая. Былі цяжкасьці з пасевным, рамонтам інвэнтару. І калі калгас трывожна перажываў падрыхтоўку да заду. Павядзе далонью па заду і малейшую шарахаватасьць абмацае. Есьць пад далонью палоска—значыць «старайся пугай».

ДРУГОЕ. Абавязковая вымена карэнных і прысьцяжных. Нельга адначасу каню даваць доўга цягаць, калі другі толькі дапамагае.

ТРЭЦЯЕ. Рэгулярная чыстка. Індывідуальныя скрабкі і шчоткі.

Правілы павялічваліся па меры таго, як Аляксей уходзіў у работу. Цяпер Аляксей Гарбацэвіч дайшоў да «конскіх пашпартоў».

— «Няма Аляксея, памёр Аляксей, хто будзе ведаць аб кожным коні, яго «біяграфію» — разважае ён. «Патрэбен пашпарт. Туды ўсю гісторыю: чым хварэў, калі, па якой прычыне, якія асаблівасьці. І ветэрынару лягчэй».

Прыдзе, бывала, ветэрынарны доктар і пытае:

— Калі хварэў?

— Пад «Спаса»...

— Доўга?

— Месяц, паўтара, а мо' й цэлых два...

Правілы прымалі, да працы прызвычаіліся, і калі старшыня калгасу піша бывала пісьмо: «Дай «Гняздо та» да станцыі», Аляксей прыбягае ў кантору калгасу з лямантам:

— Ніякіх коняй, тав. старшыня! Я за коняй адказваюць хочу! «Гняды» прышоў з поля — яму зараз адпачынак, і крапка! Няма «Гнядога», ня дам!

Аляксей мае рацыю, і старшыня згаджаецца.

***

Вёска Дукарка даўно славілася масьцераўмі. Што ні хата — цесьляр. Сярод калгаснікаў імя ЦВК больш 80 проц. цесьляры і сталяры, а пагладзець калгасныя стайні—гэтага ня скажаш. З краю ў край вёскі дзьве стайні. Дзверы стайні ніколі не зачыняюцца. Зачыніш іх — і коні сонца не ўбачаць. Цесна, а калгас пакпадоўчы...

У гай, калі сяўба была скончана, пытаньне аб новай стайні рэальна вырашыцца. Паранашыні будаваць. Разабралі старыя будоўлі, трохі новых дошак і бярвеньняў і не чакаючы тэх піла, дукорскія цесьляры зрабілі шкілет стайні на 50 коняй.

Але, вось ужо трэці месяц, як крок вы толькі па палову пакрышы гонтай, як квадраты вокан чарнеюць біз шкла, — няма шыбкоў, няма шкла.

— Змагаць у старых стайнях?

Да гэтай думкі ня можа прывыкнуць Аляксей.

— Шэфа-б добрага, — выказваў ён надзею.

У апошні раз, калі ён новай стайні да зімы капітакова высьветліўся. Аляксей пачаў перабудоўвацца. Гэта арыбавіла новыя клопаты.

Пасьля гэтага ў пасьцепнай калгаснай газэце зьявіўся першы выклік на спаборніцтва за лепшы догляд за коньмі.

***

Гэтыя дні ў калгасе імя ЦВК сапраўды гарачыя. Гэта штурмавыя дні бальшавіцкай уборкі і малацьбы. Ад цямна да цямна — рабочы дзень. З золакам выводзяць коняй і позьняй ночы вяртаюцца яны да стойлаў...

... Рабочы дзень конюха Аляксея— куды большы, чым у калгасьніка. Аляксей з 5 гадзін раніцы — на стайні, толькі ў 2 гадзіны з ночы ён у хаце, а ў 3 гадзіны — на начной праверцы вадзяных у стайні.

На некалькі хвілін днём — да хаты. Калі сьпяшаючыся Аляксей прачытае гарачую бульбу, жонка садзіцца на другі край стала, ва ўпор і моўч ні сочыць за Аляксеем. Калі Аляксей скончыў абед, жуючы ўстае з-за стала і накіроўваецца да дзьвярэй, чуваць пеўна-ўпрыманы голас жонкі:

— Можа пасядзеў-бы яшчэ хвілінку!

— Няма калі — кідае ён на ходу, жадаючы пазьбегчы гутаркі.

Зараз-жа — за дзьверы, на двор. Аляксей прыходзіў ночы да стайні ў сьвяшчную хвіліну і ўходзіў з яе ціха і пакрыўджаны. Па сутнасьці Аляксей уклінуўся ад мачымай і нямінучай гутаркі. Так цягнулася да лета.

Здавалася, што ўсё йшло добра. У хаце, у тыя мінуты, калі Аляксей прыходзіў на абед, больш расмоў не было, не было нават вытаньняў.

Цішыня ўзарвалася нечакана і рэзка.

— Або я, або Маньки, Гняды і «Сокалы»—амаль гістэрычна крычала жонка. — Што ты мне за муж... Ты што, з кабыламі пажаніўся або з жонкай?

А потым больш ціха:

— А здароўя табе не шкада.

Аляксей чакаў пакуль патухне першы гнеў.

— Я працую як трэба. Інакш не магу, — адказваю за справу. Ты, калгасьніца — павінна разумець.

З таго часу мэўчаньне было парушана. Кожны вечар тая-ж размова. Але з кожным разам менш гневу, менш гарачнасьці, больш дакораў чым рэзкасьці. Потым (як вясна праходзячая ў лета) стала спакайнейшаю, пакуль зусім не зьнікла сьляды ранейшае бязладзіцы.

... Гэтыя дні ў калгасе імя ЦВК сапраўды гарачыя. У гарачыя дні ўборкі і Аляксей і жонка не адчуваюць спомненасьці, пажынаючы бальшавіцкі ўраджай, зроблены імі-ж — конюхам і калгасьніцай Гарбацэвічамі.

«У каго ў руках конь—у таго ў руках і ўраджай!»

Б. БРАДОЦКІ.

6 ВЕРАСЬНЯ—АКРУГОВЫЯ КОННА-СПАРТЫЎНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

6-га верасьня ў Менску на іпадроме пачнуцца 4-ыя АКРУГОВЫЯ КОННА-СПАРТЫЎНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ, якія арганізуюцца камандваньнем Беларускай вайсковай акругі.

У праграме фігурная язда, прабегі на 40 і на 100 кіпёмэтр, бар'ерная скачка з дыстанцыяй—2 тысячы мэтраў, прыжкі, рысістыя іспытаньні коняй калгасаў і саўгасаў, спаборніцтвы на пярэшынства балвой падрыхтоўкі і на пярэшынство страявога каня.

Акруговыя конна-спартыўныя спаборніцтвы—адзін з відаў падагульваньня вынікаў пягернай вучобы Чырвонай арміі.

Палітычнае значэньне гэтых спаборніцтваў заключаецца яшчэ ў тым, што яны павінны паказаць калгасам БССР, як Чырвоная армія ўмее выкарыстоўваць і берагчы каня, перадаць калгасам багацейшы вопыт догляду за канём, які накоплен у Чырвонай арміі.

У часьцях кавалерыйскага корпуса імя БССР была праведзена вялікая падрыхтоўчая работа. Беларэчыцкі каўполк распачаў гэту работу яшчэ 5-6 месяцаў таму назад. Гэта дапо магчымасьць палку прыйсьці да спаборніцтва ў поўнай гатоўнасьці. Рад таварышоў на чале з камандзірам тав. ВЕРАБ'ЁВЫМ не адзін раз прымаў удзел у конна-спартыўных спаборніцтвах, атрымаўшы прызы за добрыя паказальнікі ў конна-спартыўнай падрыхтоўцы.

Вялікія клопаты да свайго баявога друга—каня праявілі байцы і камандны склад Фрунзаўскага каўпапку. Да кожнага камандзіра і байца, які прымае ўдзел у спаборніцтвах прымацаван конь, якога баец сыстэматычна сам апрацоўвае.

Тое, што спаборніцтвы прыстасаваны да ўсебеларускага зьлёту конюхаў-ударнікаў павінна падкрэсьліць, што конюх—ударнік у нашай пралетарскай дзяржаве зьяўляецца важнай і адказнай асобай, бо яму даверяецца калгасны конь, яму даручаюць кармленьне і нагляд за правільным выкарыстаньнем калгаснага каня. Спаборніцтвы паказваюць, што ў справе зьбераженьня калгаснага каня конюх можа прарабіць тую-жа работу і так-жа добра як і баец Чырвонай арміі зьберагаючы свайго баявога каня. Гэта асабліва важна. Таму, што калгасны конь ня толькі цягавая сіла ў калгасе, але і будучы памочнік конюха ў баю, калі прыдзецца абараняць заваёвы пралетарскай дыктатуры ад нападу імпэрыялістаў.

***

КОННА - СПАРТЫЎНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ БУДУЦЬ АДБЫВАЦЦА 6, 7, 8 і 9-га ВЕРАСЬНЯ. У іх прымуць удзел і дэлегаты ўсебеларускага зьлёту конюхаў.

7-га верасьня дэлегаты зьлёту конюхаў выедуць у пягэр кавалерыйскай дывізіі, дзе з імі будзе праведзен аднадзенны сэмінар па абмену вопытам па догляду за канём.

***

У сувязі з спаборніцтвамі ад ЦК саюзу рабочых жывёла-гадоўчых саўгасаў СССР—шэфа кавалерыйскага корпусу імя БССР атрымана наступная тэлеграма:

«Горача вітаем посьпехі корпусу ў справе баявой падрыхтоўкі.

***

Неабходна каб прафсаюзы заблісьпечылі арганізаваны паход на іпадром рабочых мінскіх фабрык і заводаў.

„... Трэба, наогул, па-сапраўднаму ўзяцца за конскую справу, пакуль яшчэ не позна. Усё, што тут намі ўпушчана, можна вельмі лёгка навярстаць. Для гэтага патрэбна толькі сур'ёзная, па справядлівасьці заслужаная ўвага каню. Не забывайце, што конь патрэбен абароне, таксама як і гаспадарцы".

(ВАРАШЫЛАЎ)

Слова дэлегатам

(ГУТАРКІ З ДЭЛЕГАТАМІ УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЛЁТУ КАЛГАСНЫХ КОНЮХАЎ-УДАРНІКАЎ)

І. І. Бязьлюдаў

Калгас „Чырвоная зьмена", Орша

„ЗЬЕЗД НАМ ПАВІНЕН ДАЦЬ НАВУКУ"

— Калгас у нас невялічкі—38 гаспадарак, і конскага пагалоўя ня шмат: 27 стаеньнікаў... Але вось надоечы быў агляд—і прыхналі нашых коняй вышэй сярэдняй сытасьці.

А справа ўся ў догляцце, у клопатах аб кані. Увосну, вось, хоць і сена хапала (тут ў нас—сэлёўныя, багатыя!), ды мы яшчэ па 3 фунты па дзень аўса і па 10 фунтаў бульбы —на перамежку—кожнаму! Чаму-ж ім ня быць вышэй сярэдняй сытасьці?!..

У нас, треба вам сказаць, камсамольцы ў конскай справе дапамагаюць. Камсамольская ячэйка—шэф над калгасным канём. А калгас—першы ў раёне. Прыйшлі, вось, «Чырвоную зьмену» нашу на 600 рублёў за датэрміновую здачу працукцыі дзяржаве...

Вясной датэрмінова ўзаралі арабы клін. А чаму? Таму, што цягавая сіла ў працаку была! Мала таго, што на сваіх палёх справіліся—дык і суседзям дапамагалі. Выяжджалі ў калгасы «Чырвоны мэліяратар», «Барацьбіт». Нашых коняй у сельсавеце ведаюць!

2 брыгады ў нас—2 конюхі. Працуем, дарма казаць, сумленна, шчыра... Ведаем, што такое ў калгасе конь! Да трыццаці, я вось выпрацаваў ужо 253 працадні (і на сенажаці з касой вазіраў). Летась за год меў 398 працадзён, а сёлета мяркую выпрацаваць ня менш 500!

А наконт зьезду—дык ён нам павінен навуку даць,—як яшчэ лепш за канём сачыць, яшчэ мацнейшых выгадоўваць! Не для таго-ж ехалі, каб толькі Менск пабачыць... Каб добра працаваць — вучыцца трэба, і ўвесь час вучыцца... Так і запішыце! А зьезд нас навучыць.

С. І. СЫС

Калгас „Савецкая Беларусь", Рэчыца

САКРЭТ НАШЫХ ПОСЬПЕХАЎ

— Як мы дабіліся таго, што калгас за добры догляд коняй атрымаў прэмію ў 500 рублёў і пачэсны водзыў, а я—прэмію і гана ровую грамату? А ня дужа складана! Перш-на-перш, трох конюхаў разьбілі на брыгадах—на тры брыгады, а чацьвертага, старэйшага маладзяком нагрузілі: няхай выгадуе маладое пакаленьне... Ну, і выгадуе...

Кожная брыгада за сваё пагалоўе адказвае... Апроч таго, прымацаван конь да конюха калгасьніка. Так што ў нас абавязкі ў догляцце за канём няма. Кожны сочыць, як сказаць, за цягавай сілай—шануе яе, цікавіцца...

Усяго ў нас коняй 62, цяжкіх—сямёра, матак—адзінаццаць. Злучную кампанію летась правялі ўзорна, прыкладна—яшчэ ня трэба. Маладзяк у калгасе—надзейны!

Наконт корму я вам скажу так, што тут справа ня ў колькасьці. Можна і шмат яго зашумаць, а толку ня выйдзе. Галоўнае—рацыяналізацыя, вось што! Уменочы трэба корм задаваць. Берагчы яго трэба.

Сам я ка гэтай работе ўжо тры гады—цэлы час знаходжаньня ў калгасе. Прэмію атрымаў у Гомелі, у кастрычніку, на міжрайонай выстаўцы жывёлагадоўлі. Работу гэтую паважаю, тіцаць на думаю. А як пачалой працаваць ды як лепш—стаць першы зьезд і пакажа.

Я думаю, што і надалей работу не пакінем!

Ф. Ф. Міхалачкін

Калгас „Чырв. фізкультурнік", Лёзна

КОНЬ—КАЛГАСНАЯ СІЛА

— З 52 коняй гэтай вясной у нашай гаспадарцы, 10 зусім не маглі працаваць на полі... Дрэнныя былі коні зусім, зьнясіленыя. Старое кіраўніцтва калгасу давяло да поўнага заняпаду конскае пагалоўе.

Цяпер-жа, як абяцалі, можна сказаць сгарышыню—прыслалі з сельсавету камсамольца **Вінаградава** на яго месца—ліпчай справа пайшла! За лета коні значна паправіліся, сярэдняй сытасьці сталі. Цяпер—усе працуюць здольныя!

Уся мудрасьць тутака ў правільным доглядзе, увазе да каня. Вясной, скажам, калі корм сухі—трэба часьцей паіць, 4-5 разоў у суткі. Зноў-жа сваячасова і карміць трэба. Я цяк не адыходзіў ад стайні, пакуль усю яе па ногі не паставіў!

«Чырвоны фізкультурнік» з вясны лічыўся ў сельсавеце аж на апошнім месцы па ўсіх паказальніках. А зараз—наперадзе! Перадавы, можна сказаць, калгас. А ўсё таму, што з боку партыйнай ячэйкі сапраўднае кіраўніцтва і дапамога ёсьць!

Сакрэтар ячэйкі тав. **Краўчэнка** часта ў калгасе бывае. А як прыдзе—з ім і па стайню, як, маўляў, Хведар Хведаравіч, у рабе конікі? Гадуюцца?

— А як-жа?—кажу: дзе-ж яны дзе пушца, ліха іхнай матары! Коні—во!

Зноў-жа сацыяпаборніцтва ды ўдарніцтва калгас наш наперад вынесьлі. У нас абяцала і сапраўды ёсьць 15 ударнікаў, ды чалавек дзесяць ударнікаў-мужчын. Працуюць адтана!

На зьезд гэты мяне апошнім схопам адкамандыравалі, каб вучыўся лепей яшчэ дапамагаць нашую цягавую сілу, бо ў ёй—у цягавай—наша сіла і посьпех!

ЗА ДОБРАГА КАЛГАСНАГА КАНЯ, ЗА СУМЛЕННАГА КОНЮХА

З году ў год, з месяца ў месяц расьце тэхнічная ўзброенасьць сельскай гаспадаркі, але ўсё ўзрастаючая мэханізацыя сельскай гаспадаркі ніколькі не зьмяншае вялізарнага значэньня каня, як жывой цягавай сілы на саўгасных і калгасных палёх.

Нагрузка на адзінку цягавай сілы ў паасобных раёнах БССР даслягае больш 9-10 га (Бялыніцкі раён — 10,5 га, Чэрвеньскі — 10 га, Бярэзінскі — 9,6 га, Гарадоцкі — 9,6 га). З гэтых лічбаў відаць, якое вялікае значэньне мае конь у сельскай гаспадарцы.

Вялізарную ролю адыгрывае конь і ў справе абароны краіны. «Абараняць краіну без каня, — гаворыць т. Будзённы, — немагчыма. Конь у войску абслугоўвае артылерыю, абозы, нясе службу сувязі, а галоўным чынам конь патрэбен для коньніцы, але ўжо не як сродак для перасоўваньня, а як сродак бою».

Усё гэта разам узятае патрабуе ад нас самай сур'ёзнай увагі да захаваньня каня.

Аднак, ня гледзячы на рад сур'ёзных якасных эрухаў у захаваньні конскага пагалоўя, на рост маладняка, у паасобных раёнах БССР усё яшчэ маюць месца злачынныя адносіны да каня. Недаацэнілі таго вялізарнага значэньня, якое мае конская цягавая сіла.

Калгас **«Чырвоны Кастрычнік»**, Старобінскага раёну, мае 127 коняй, з якіх 50 проц. слабасільных. Трое коняй зусім выйшлі са строю, 14 жарабят прыведзены ў поўны заняпад.

У калгасе **«Інтэрнацыянал»**, Дзяржынскага раёну, з 45 коняй 14 зусім ня прыгодныя для работы, а рэшта—ніжэй сярэдняй сытасьці. Ці варта даказваць, што гэта атрымалася таму, што на стайні пралезьлі кулацкія элемэнты, якія праводзяць там сваю шкодную работу па зьнішчэньні конскага пагалоўя.

Ёсьць раёны, дзе недапушчальна мала ўвагі аддаецца справе гадаваньня каня. Аб гэтым сьведчаць факты зрыву злучной кампаніі па Сіроцінскім раёне, дзе з 3.100 кабыліц пакрыта ўсяго 255, па Гарадоцкім — з 5.050 пакрыта 1.139, па Мазырскім — з 4.150 пакрыта ўсяго 1.678.

Ці варта даказваць што там, дзе партыйныя і савецкія арганізацыі ўсьвядомілі задачы, пастаўленыя партыяй па конгадоўлі, мабілізавалі калгасны актыў на выкананьне гэтых дырэктыў, на барацьбу з рэшткамі кулацтва, там маюць вялікія дасягненьні ў справе захаваньня каня. Да такіх раёнаў адносяцца: **Пухавіцкі, Кармянскі, Бабруйскі, Старобінскі** і рад іншых.

Узяць хоць-бы калгас **«Чырвоны бор»**, Старобінскага раёну. У гэтым калгасе з 30 коняй, якія абслугоўваюцца конюхам **Біруля** Антонам і калгасьнікамі **Татурам** Адамам і **Шпакоўскім** Андроем, няма ні аднаго слабасільнага, памулянага або пацёртага каня. Калгас «Іскра», Дзяржынскага раёну, калгас «Чырвоная Беларусь», Жлобінскага раёну (конюх Дзятлаў) і шмат іншых калгасаў і асобных конюхаў і калгасьнікаў-ударнікаў паказваюць лепшыя прыклады барацьбы за здаровага каня і за рост конскага пагалоўя.

Асаблівай увагі заслугоўвае мерапрыемства, што праводзіцца па ініцыятыве бюро РК Старобінскага раёну. Перад уборачнай райком правёў поўны вэтарыянарны агляд усіх коняй раёну. З самай вясны там прыкавана увага ўсіх калгасьнікаў да каня. Старобінскі райспажыўсаюз вылучыў фонд прамтавараў для прэміяваньня лепшых конюхаў-ударнікаў, арганізатараў круглагадовага пасьбы коняй.

Калгаснаму конюху выданы спэцыяльныя кніжкі, у якія заносіцца адэка камісіі стану коняй. За лепшыя выпікі конюх прэміруецца. У выніку гэтага ў Старобінскім раёне дабіліся значных посьпехаў у справе конгадоўлі. **Гэты прыклад варты перайманьня.**

У нас нямала добрых прыкладаў барацьбы за добрага каня.

225 конюхаў-ударнікаў на ўсебеларускім зьлёце перададуць свой вопыт, сваю практыку штодзённай барацьбы за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду аб канягадоўлі, аб павялічэньні конскага пагалоўя, аб правільным выкарыстаньні калгаснага каня. Зьлёт зьявіцца практычнай школай для пераймаьня вопыту лепшых конюхаў.

Мы ўсюды сустракаемся з фактам, што лепшымі калгасьнікамі-конюхамі зьяўляюцца былыя чырвонаармейцы-кавалерысты, якія ў войску навучыліся як трэба даглядаць каня, як трэба яго карміць, паіць, чысьціць, у парадку трымаць стайню, збрую. Наведаўшы стайні Н-скай кавалерыйскай дывізіі, удзельнікі зьлёту на практыцы ўбачаць, што і як трэба зрабіць, каб у кожным калгасе коні былі такой-жа сытасьці, як у Чырвонай арміі.

Арганізацыя працы каня такім чынам, каб конь працаваў рэгулярна, ня менш 300 дзён у год, пры штотыднёвым адпачынку, належнае кармленьне і добры догляд (догляд кашэт, чыстка коняй, кармушак, стойлаў стайняў і г. д.), разьбіўка коняй па групах — група сытых, здаровых, прыгодных для цяжкіх работ і група коняй ня досыць сытых, жарэбных матак і інш. і, нарэшце, група слабых коняй, якіх у даны момант нельга скарыстоўваць па працы; дыфэрэнцыяваны догляд і дыфэрэнцыяванае выкарыстаньне на працы ў залежнасьці ад групы коняй; пагонка зброі да кожнага каня, — усё гэта зьяўляецца найпершым абавязкам конюха — цэнтральнай фігуры захаваньня і вырошчваньня конскага пагалоўя.

Пры адэнцы працы конюхаў і калгасьнікаў, працуючых на конях, у радзе месц ня ўлічваецца сытасьць коняй. Конюх-ударнік і лодыр у большасьці выпадкаў атрымліваюць аднолькавую аплату, бо разьлік ідзе за штукі, а не з якасьці догляду.

Зьлёт, бязумоўна, скажа сваё слова па гэтым пытаньні.

Кліматычныя ўмовы восені гэтага году ва ўсю шырыню ставяць перад намі пытаньні рацыянальнага выкарыстаньня каня. Ня ўсюды можна будзе ўзьнімаць зяблева трактарам, не па ўсіх дарогах машына эможа перавозіць збожжа, бульбу і інш. прадукты. Вялікую ролю будзе тут адыгрываць конь.

Добрым і правільным доглядам поўнасьцю захаваць і максымальна выгадаваць конское пагалоўе ў калгасе, не дапусьціць ні аднаго выпадку абдаваньня жарэбных кабыл і падзеннем маладняка, правільна арганізаваць круглагадовае выкарыстаньне каня на працы пры абавязковым адпачынку, вывесьці ўсё конское пагалоўе з зімы ў поўнай баявой падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы 1934 году — баявая задача дня.

У рашучай барацьбе з рэшткамі кулацтва, магутным разгортваньнем сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва армія конюхаў-калгасьнікаў у БССР з посьпехам выканае дырэктывы партыі і ўраду аб канягадоўлі.

КРАСОЎСКІ.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

КОНЮХАЎ-ЎДАРНІКАЎ

ТАВАРЫШ У БУДУЧЫХ БАЕХ—БЕРАГЧЫ КАНЯ, ЯК ВОКА!

„Конюх, як трактарыст—гэта зараз самая сур'ёзная і самая адказная пасада ў калгасе. Зразумейце гэта. У каго ў руках калгасны конь, у таго ў руках ураджай нашых палёў і вашы даходы, дык вазьмецеся зараз-жа за праверку таго, наколькі надзейныя гэтыя рукі".

(З звароту Усесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў)

Залаты фонд

У мінулым на стайнях калгасу «КАМІНТЭРН» арудавала кулацкае ахвосьце. На чале калгаснай каняга-таварнай фермы стаяў кулак Ламэка, які разам з групай кулацкіх прыхвасьняў зьнішчаў калгаснае конскае паголоўе.

КАЛІ НА СТАЙНІ АРУДВАЎ ВОРАГ

Конюх Капановіч зьбіваў каштоўных племянных кабылін. Былы старшыня калгасу Будай глядзеў скрозь пальцы на кулацкае шкодніцтва.

7 зьтворнікаў і ўсе племянныя маткі былі абжэбалічаны. Іх давяралі каму попала. Сёньня яны сталі ў адным месцы, заўтра ў другім і г. д. Даволі прывесьці адзін красамоўны факт: лепшыя племянныя жарабцы «Авангард» і «Бравансон» доўгі час сталі ў зусім цёмным памяшканьні і ім пагражала сьлепата.

Да чаго-ж гэта прывяло? Амаль палова коняй, а іх у калгасе было 215, аказаліся слабасільнымі. 6 коняй зусім загінулі. А ў выніку сяўба ў калгасе значна зацягнулася.

Калгасны актыў пад кіраўніцтвам райкому партыі ўзяўся за ачыстку калгасу ад кулацка-шкодніцкіх элементаў.

У калгасе было выкрыта і выкінута прэч 15 кулацкіх гаспадарак. Справа пайшла ўгару. Новы старшыня калгасу т. Васілец і загатчык каняга-таварнай фермы т. Трызна рашуча ўзяліся за аздараўленьне конскага паголоўя. І перш за ўсё калгас паставіў сваёй задачай да канца па справе дабіць абязьлічку.

ЦЯПЕР СПРАВА ПАЙШЛА ІНАКШ

Да кожнай вытворчай брыгады прымацавана поўная колькасьць коняй. А ў брыгадах коні замацаваны за спасобнымі калгаснікамі, якія нясуць за іх пэрсанальную адказнасьць.

Усе коні ў брыгадах разьбіты па спэцыяльныя групы ў адпаведнасьці з прыгоднасьцю на працы.

Новае праўленьне акружыла самай шчырай увагай жаробных матак. Яны не натружаюцца цяжкай працай.

І самі калгаснікі сталі па іншаму адносіцца да калгаснага каня. У калгасе ёсьць чямала сапраўдных ударнікаў, якія беражуць каня, уважліва даглядаюць за ім, уважліва і добра клапоцяцца аб захаваньні і розьвіцьці калгаснага конскага паголоўя.

Калгаснікі не адстаюць ад калгаснікаў. Узяць хоць-бы для прыкладу калгаснікі тав. **КАПАНОВІЧ**, якая даглядае двух коняй. Калгаснікі жартуючы гавораць, што т. Капановіч «даглядае коняй як матка дзяцей».

У гэтых словах крыецца глыбокая праўда. Коні Капановіч маюць самы лепшы выгляд. Яшчэ ня было такога выпадку, каб тав. Капановіч прывяла на стайню сваіх коняй зморанымі, або ўсклёпанымі. А яна на гэтых конях і арэ, і сеяны возіць, аварятна добрасумленна і своячасова выконваючы ўсе заданьні брыгадзіра і праўленьня.

І нават калі работа скончана і коні пастаўлены на адпачынак т. Капановіч часта заходзіць на стайню. Яна пільна правярае ці напоены яны, ці накормлены, ці зроблена як сьлед пад сьцілка.

КОНЮХ ЗУЕЎСКІ ПАКАЗВАЕ, ЯК БЕРАГЧЫ КАЛГАСНАГА КАНЯ

Уважна даглядае коняй і калгаснік **В. ДОЎНАР** і калгаснік **К. КУЛІКОЎСКІ** з брыгады брыгадзіра Вараб'я. Іх коні, на якіх яны працуюць, заўсёды своячасова накормлены, напоены, ачышчаны і таму так добра спраўляюцца з усімі работамі.

Або ўзяць конюха **ЗУЕЎСКАГА.**

Раней, пакуль ён не прыйшоў на стайню, амаль уже коні нават не маглі ўставаць. Да таго іх давяло кулацкае ахвосьце, якое ізмучыла зьнішчыць калгаснае конскае паголоўе. Усе коні былі зморана, загнаны і амаль зусім не маглі працаваць.

Але вось на стайню прыйшоў т. Зуеўскі. Ён разам з іншымі лепшымі калгаснікамі горача ўзяўся за парадак на калгаснай стайні. Усе слабейшыя коні былі ўзяты пад асобны нагляд. Ім давалі меншую нагрузку і ўстанавілі ўзмоцненае кармленьне.

Адным словам, Зуеўскі разам з Доўнарам, Кулікоўскім і іншымі калгаснікамі даглядалі кожнага каня як вока.

І гэта не перанавалітэньне. Цяпер не назнаць коняй у брыгадзе брыгадзіра Вараб'я. Куды толькі дзеліся зморыны, загнаныя коні, якія яшчэ ў недалёкім мінулым ледзь сталі на нагах! Цяпер усе коні, у выніку добрага і ўворнага догляду, сталі **ЛЕПШЫМІ ў калгасе.**

Усе коні направіліся і маюць самы добры выгляд. Брыгада Вараб'я сустрэла ўборку ўраджаю з падрыхтаванай конскай цягавай сілай.

КОНІ ДОБРА ШЛІ Ў ЖНЯВЯРКАХ І ДОБРА ВЫКОНВАЮЦЬ УСЕ ЦЯЖКІЯ С.-Г. РАБОТЫ

Паказвае прыклад узорнай работы і старшы конюх камсамолец Макоўскі, які забясьпечыў своячасовае паеньне, кармленьне і чыстку каня.

ГАСПАДАРСКАЯ КЛАПАТЛІВАСЬЦЬ, УВАГА

Калгас паступова ліквідуе цяжкую спадчыну, пакінутую мінулым кулацкім кіраўніцтвам. Усё больш у догляде за канём адчуваецца гаспадарская клапатлівасьць, гаспадарская ўвага. Да коняй падабрана і падагнана збруя.

У калгасе ёсьць тры рысары, якія рэгулярна правяраюць становішча збруі ў кожнай калгаснай стайні.

Калгасны каваль — у мінулым баец Чырвонай арміі — арганізаваў конюхаў на акуратную расьлістку капыт і своячасовую коўку коняй.

Цяпер калгаснікі энэргічна рыхтуюцца да стойлавага перыяду. Кожная калгасная стайня прыводзіцца ў поўны парадак да зімы (ацяпляецца, гамантуецца і г. д.). Да лістапада будуць скончаны пабудовай дзве новыя вялікія стайні на 160 коняй. Калгаснікі заключылі сацыялістычны дагавор на своячасовае і добраякаснае скончэньне будаўніцтва.

І цяпер у раёне зусім правільна гавораць, што коні калгасу «Камінтэрн» — лепшыя ў Дзяржынску, а некаторыя з іх лепшыя і ва ўсёй рэспубліцы.

Калгасная каняга-таварная ферма мае 75 племянных коняй — 50 племянных матак, 20 галоў племяннога маладняку і рэшта — племянныя жарабцы. Калгасная фэрма — **ЗАЛАТЫ ФОНД КАЛГАСУ.** Прадаўшы трох племянных жарабкоў калгас атрымаў за іх 18 тыс. рублёў.

Але ні на адну мінуту нельга супакойвацца на тым, што дасягнута. Дасягнута шмат, але зроблена далёка ня ўсё. У калгасе яшчэ ёсьць цэлы рад самых сур'ёзных недахопаў, якія павінны быць зьнішчаны неадкладна — у самым хуткім часе.

НЕ ЗАБЫВАЦЬ ПРА КЛЯСАВУЮ ПІЛЬНАСЬЦЬ

Узяць хоць-бы становішча з аплатай працы конюхаў. Тут яшчэ не ліквідавана ўраўнілаўка. Адны працуюць сапраўды сумленна, сапраўды ўдарна, другія — горш, а аплата па сутнасьці адна і тая-ж.

Прэміяльная сыстэма яшчэ не ўведзена. І гэты недахоп трэба выправіць неадкладна.

Конюхаў-ударнікаў трэба акружыць увагай, аказваць ім перавагу, перанесьці іх вопыт на ўсіх калгаснікаў.

І галоўнае — ні на сэкунду не паслабляць клясавай пільнасьці. Вораг яшчэ поўнасьцю не выкрыт, не выяўлен, не вытнан. Ён яшчэ захаваўся ў паасобных брыгадах і імкнецца шкодзіць ціхай сапай.

Вось некалькі красамоўных фактаў.

У конюхі пралез, напрыклад, кулацкі прыхвасьцень Жданові, які пры ўсякім зручным выпадку на-барбарску абыходзіцца з канём.

У Сакольскай вытворчай брыгадзе старэйшы конюх Філатовіч дапусьціў што жарабят путалі дротам. У выніку яны парэзалі сабе ногі.

Конюх Качан яшчэ зусім нядаўна злачынна зьбіў трохгадовую кабылічку, так што яна амаль поўнасьцю страціла сваю працаздольнасьць.

Праўда, гэта — адзінкавыя факты. Але яны сьведчаць, што пільнасьць у калгасе яшчэ не заўсёды бывае на патрэбнай вышыні, што ў калгасе часамі каня яшчэ давяраюць неправераным, а то і проста варожым людзям. З такім становішчам трэба неадкладна і рашуча пакончыць.

СТАЦЬ УЗОРНЫМ КАЛГАСАМ ПА КАНЯГАДОЎЛІ

Калгас мае ўсе ўмовы і абавязан стаць узорным калгасам па захаваньні і разьвіцьці конскага паголоўя. Трэба толькі да канца вышыбіць з калгаснай стайні варожае ахвосьце, трэба толькі яшчэ больш і шырэй на справе разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж калгаснікамі на лепшы і добрасумленны догляд каня.

Камінтэрнаўцы павінны рашуча падцягнуцца. А гэта яны могуць і абавязаны зрабіць.

З.

Ільнацерабілка ў надзейных руках

НА ЗДЫМКУ: загадчык вытворчасьцю 4-га вучастку Шклоўскай МТС—лепшы арганізатар работы на ільнацерабілках «Камсамолка» Філянаў Паўла. Агрэгат ільнацерабілак, за які адказвае тав. Філянаў, зьяўляецца лепшым паказальнікам таго, як пры добрым доглядзе «Камсамолка» можа апраўдаць сябе на рабоце.

Калгас «КАМІНТЭРН», ДЗЯРЖЫНСКІ раён.

ПРА КАНЯ

У часе боек, буразвоху
Ночнага і дзённага
Бараніла нашы гоні
Конніца Будзённага!

* * *

І наперад нёс герояў
Цераз кулі і агонь
Адмятаючы благое
Баявы таварыш—конь!

* * *

І сягоньня—у гадзіны,
Поўныя будоўлі,
За канём сачыць павінны,
За яго гадоўлай!

* * *

Сёньня там, дзе сьпеюць нівы
Шчодрымі зярнятамі,
Сілай нашых калектываў
Рысакі заўзятыя!

* * *

Але там, дзе ў сьветлых сёлах
Ураджаі важкія —
Часам ходзяць ля жывёлы
Людцы, скрозь ня паскія...

* * *

А дзе рукі разгільдзяя
На кулацкай прывязі—
Конь клапот не атрымае
І ў слябе ня вывезе.

* * *

Непарадкаў тут да званьня
Нам пазбыцца выпала.
Зьезд ударнікаў са стайні
Іх павоўна выпаліць!

ЮР. ЛЯВОННЫ.

УЗМАЦНІЦЬ КАМСАМОЛЬСКАЕ ШЭФСТВА

Адзін мільён 260 тысяч га азімага кліну навіна добраякасна і своячасова засеяць Савецкая Беларусь у гэтым годзе, у тым ліку па сацыялістычным сэктары — 764 тыс. га.

Мільён 127 тыс. га патрэбна ўзьняць пад зяблева, у тым ліку па сацыялістычным сэктары — 783.300 га.

Заданьне партыі і ўраду павінна быць выканана добраякасна і своячасова.

Якаснае правядзеньне гэтых работ у тэрмін, галоўным чынам, будзе вырашаць конь. Таму — максымум увагі каню. У часе веснавых работ на многіх калгасах мы мелі просты зрыў сяўбы, таму што ня была падрыхтавана конская цягавая сіла.

Факты паўтарэньня мінулых памылак даюць сябе адчуваць у некаторых калгасах і зараз, у часе асеньняй сяўбы. У калгасе «Краіна Саветаў», Слуцкага раёну, коні злачынна замучаны, дрэнна даглядаюцца. Апалягічнае становішча і ў калгасе «Праўдаўнік», Старобінскага раёну.

Вялізарнейшая адказнасьць у рабоце за моцнага, здаровага, калгаснага каня ўскладаецца на камсамол, які зьяўляецца шэфам над канём. Усе члены партыі і камсамольцы калгасаў і саўгасаў абавязаны «быць прыкладам для ўсіх калгаснікаў і саўгасных рабочых у справе правільнага выкарыстаньня, догляду і беражліва-гаспадарчых адносін да рабочай жывёлы і ў першую чаргу да каня» (ЦК УсеКП(б) і СНК СССР).

Год і два месяцы прайшло з таго часу як камсамол узяў шэфства над канём. Гэты прамежак часу характэрны для камсамольскай арганізацыі ўкартай, настойлівай барацьбой за палепшэньне каняга-доўлі, за вырошчваньне здаровага і выносьлівага каня. Гэтым прыкладам можа служыць камсамольская ячэйка калгасу «Новае жыцьцё», Слуцкага раёну, ячэйка калгасу «Чырвоны сьцяг» Лепельскага раёну, ячэйка калгасу «Інтэрнацыянал», Гомельскага раёну.

Збожжа дзяржаве.

НА ЗДЫМКУ: прыёмка збожжа на Церахаўскім пункце Загатзбожжа.

Добрых прыкладаў работы нямала. Але задача камсамольскага шэфства над канём заключаецца ў тым, каб замацаваць і выкарыстаць вопыт лепшай работы, зьнішчыць фармальны і дэкларацыйны падыход да шэфства. Мабілізаваць камсамольцаў і ўсю калгасную і саўгасную моладзь на выкананьне дырэктыў партыі аб захаваньні і разьвіцьці конскага паголоўя. Важнейшым зьвяном у шэфстве камсамолу над канём зьяўляецца вылучэньне на гэты важнейшы участак работы лепшых праверэных камсамольцаў. Задача заключаецца ў тым, каб ачысьціць стайні ад клясава-варожых элементаў, стварыць свае пастаянныя кадры каняга-доўлі.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ МОЛАДЗЬНАЯ СТАНЦЫЯ ЦК ЛКСМБ
ЛАПКОЎСКІ.

У ТЭРМІН ВЫКАНАЕМ ПЛЯНЫ АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ І ГАРОДНІНЫ ЛЕНІНГРАДУ

У Менск прыехаў ушаноўваны Савету Працы і Абароны па адгрузцы гародніны і бульбы ў Ленінград т. **Шапашнікава.**

Тав. **Шапашнікава** ў гутарцы з супрацоўнікам **«Зьвязды»** сказала:

— Ленінград са сваім амаль трохмільённым насельніцтвам 50 проц. сваёй гадавой патрэбнасьці ў бульбе забясьпечваецца за кошт вывазу з БССР. З 425.000 тон бульбы, патрэбных для выкананьня пляну снабжэньня Ленінграда, 260.000 тон прыпадае на БССР.

Ужо гэта адно паказвае наколькі важнае значэньне для снабжэньня рабочых Ленінграду мае пасьпяховасьць выкананьня пляну вывазу ў Ленінград бульбы і гародніны высокай якасьці.

Жнівень паказаў, што цэнтральныя беларускія партыйныя і савецкія арганізацыі аддалі вялікую ўвагу выкананьню пляну адгрузак бульбы Ленінграду. Рад раёнаў, як **Рагачоўскі, Жлобінскі, Бабруйскі** ў выніку сапраўды бальшавіцкай барацьбы і настойлівасьці здолелі ня толькі выканаць, але і перавыканаць плян. У той-жа час такія раёны як **Смалявіцкі, Клімавіцкі**—сарвалі заданьне.

Улічваючы вельмі незадавальняючае становішча са снабжэньнем Ленінграду гародніной і бульбай, перад усімі беларускімі арганізацыямі стаіць **баявая задача—ужо цяпер набіраць такія тэмпы загатовак і адгрузкі, якія далі-б магчымасьць поўнасьцю выканаць плян да 15 кастрычніка.**

Гэта тым больш неабходна ў бягучым годзе па тэй прычыне, што па ўсіх данных восень будзе кароткай. Ужо ў другой палове верасьня ў Ленінградзе чакаецца пахаладаньне і замарозкі.

Загатоўчыя арганізацыі не павінны забыць урок 1930 году, калі ў Ленінград прыбыло да 50 проц. замарожанай бульбы. **Трэба ўжо цяпер падрыхтаваць салому, маты для ацяпленьня на пунктах прыёмкі і на шляху сьледваньня. Максымум увагі павінна быць аддана забясьпячэньню пунктаў вагай, ліхтарамі, графікамі, укамплектаваньню загатоўчых пунктаў добрымі работнікамі.**

Пляпавасьць, дакладны графік загатовак па пяцідзенках павінен супадаць з такім-жа графікам падачы вагонаў. Гэта асноўная ўмова павінна быць улічана як загатоўшчыкамі, так і чыгункай.

Задача цэнтральнага і раённага друку безадкладна і з першых-жа дзён сапраўды ўключыцца ў загатоўчую кампанію, узяць бальшавіцкі тэмпы і мэтады работы.

Ленінградзкія арганізацыі аказалі пекаторую матар'яльную дапамогу загатоўчым арганізацыям БССР. Яны завезьлі аўтамашыны, будматар'ялы, тару і інш. Па мабілізацыі абкому партыі і ленсавета ў БССР **накіравана ў дапамогу раённым арганізацыям каля 100 прадстаўнікоў фабрык, заводаў і ўстаноў.**

Апошні пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б даў разгорнутую праграму работы і вызначыў задачы партыйных, савецкіх і загатоўчых арганізацый у справе выкананьня дзяржаўнага пляну здачы бульбы і загатоўкі гародніны.

Гэта праграма служыць залогам таго, што калгасная грамадзкасьць пад кіраўніцтвам раённых партыйных арганізацый і палітаддзелаў будзе па бальшавіцку змагацца за баявое і высокаякаснае выкананьне дзяржаўных заданьняў.

Гэтым самым будзе нанесены са крушальны ўдар па кулацкім і апартуністычным элементам, якія імкнуцца сарваць выкананьне такой важнай гаспадарча-палітычнай задачы, як бесьперабойнае снабжэньне бульбай і гародніной пралетарыяту г. Леніна.

20 верасьня апошні тэрмін выкананьня фінпляну III кварталу

Раёны і сельсаветы рапартуйце аб датэрміновым выкананьні фінансавых заданьняў

ТЭМПЫ НЕВЫСТАРЧАЛЬНЫЯ

За апошнюю дэкаду жніўня рад раёнаў і сельсаветаў Беларусі дабіўся значнага пералому не толькі па мабілізацыі сродкаў але і па даходах з аграмаджанага сэктару. Сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы барацьбы за фінплян паказалі **Старобінскі** раён, які дабіўся за дэкаду прыросту выканаць ня квартальнага пляну на 42,6 проц. **Рагачоўскі** на 37,1 проц., **Жытковіцкі** — на 32,1 проц., **Асьвейскі** — на 27 проц., **Заслаўскі** — 24,8 проц.

Рад сельскіх саветаў ужо рапартуюць аб перавыкананьні квартальных заданьняў. **Нічыпараўскі** сельсавет, Шклоўскага раёну, выканаў квартальны плян на 115 проц., **Забалоцкі** сельсавет, Смалявіцкага раёну, на 108 проц. і **Амельянаўскі** сельсавет таго-жа раёну на 103 проц. **Кушлікоўскі** сельсавет, Полацкага раёну, на 101 проц., **Клетчанскі** сельсавет, Сіроцінскага раёну, на 100 проц., **Тутчынскі** сельсавет, Касьцюковіцкага раёну, на 100,2 проц. у тым ліку па пазыцы 2-й пяцігодкі на 107 проц.

Усё гэта гаворыць за тое, што тыя раёны і сельсаветы, якія справу мабілізацыі сродкаў узьялі па належную вышыню, дабіліся не толькі выкананьня, але і перавыкананьня пляну.

Посьпех паказаных раёнаў і сельсаветаў як нельга лепш даказвае, што праваднімыя зараз сельгаскампаніі ня толькі не перашкаджаюць, а наадварот спрыяюць выкананьню фінпляну. І гэта зразумела, бо плян мабілізацыі сродкаў у III квартале ў асноўным праходзіць за кошт вясковых плацяжоў — сельгаспадатку, самаабкладаньня, страхоўкі, пазыкі 2-й пяцігодкі і г. д. У вёсцы асядаюць у сувязі з загатоўкамі вялізарныя сумы грошай, і гэта зразумела не можа не спрыяць выкананьню фінансавых заданьняў.

Трэба толькі арганізаваць работу. Уцягнуць у яе шырокія працоўныя масы. Ажывіць работу камсодаў, даць канкрэтнае заданьне кожнаму члену сельсавету, кожнаму члену сэкцыі, кожнай дэпутацкай групе і, бясспрэчна, посьпех будзе забясьпечан.

Гэтай зусім простай рэчы, на жаль, не разумеюць рад раённых, партыйных і савецкіх арганізацый, рад сельсаветаў. Катэгарычныя дырэктывы партыі і ўраду, — **выканаць фінплян III кварталу да 20 верасьня,** — яшчэ не знайшлі канкрэтнага адбітку ў рабоце раду раёнаў і сельсаветаў. Па **Бяльніцкім, Лоеўскім, Уваравіцкім, Сураскім, Сеньненскім, Карманскім** і іншых раёнах апошняя дэкада не дала амаль ніякага зруху ў выкананьні фінпляну. 24-30 проц. выкананьня агульнага квартальнага пляну пры ўзросьце за дэкаду выкананьня на 4-5 проц. гаворыць аб поўнай адсутнасьці якой-бы там ні было арганізацыйна-масавай работы, гаворыць аб паўнасьці самацёку і чарговасьці кампаній у гэтых раёнах.

«Раней правядзем уборку і збожжазагатоўкі, а потым возьмемся за фінплян, — вось асноўная прычына зрыву фінансавых заданьняў. Што гэта сапраўды так, са ўсёй яскравасьцю пацьвярджаюць матар'ялы, якія ў апошні час друкаваліся на старонках «Зьвязды» па Бабруйскім, Сіроцінскім і інш. раёнах.

Друк таксама не ўзяўся па-сапраўднаму за фінансавую работу. Лепшыя формы і мэтады работы перадавых раёнаў і сельскіх саветаў яшчэ не сталі здабыткам шырокай пралетарскай грамадзкасьці адстаючых раёнаў і сельсаветаў.

Дырэктыва ЦК КП(б)Б, якая абавязвае раённыя партыйныя арганізацыі ўзмацніць работу па мабілізацыі сродкаў і катэгарычна забараняе мабілізаваць фінансавых работнікаў па іншым кампаніі і перавозіць на іншыя работы, радам раёнаў не выконваецца. Загатчык Жытковіцкага райфа Русанаў мабілізаваны часова ў сельсавет сакратаром партыйнай ячэйкі. Загатчык Крычаўскага райфа Гафт мабілізаван на ўборачную кампанію. Інспэктары па дзяржстрахаваньні Прапойскага раёну, Астахаў і Барысаўскага раёну Хадасевіч мабілізаваны на пастаянную работу ў сельскія саветы.

Па раду раёнаў мабілізуюцца ад усе фінансавыя работнікі, у выніку закрываюцца раённыя фінансавыя ўстановы. Такія факты мелі месца ў Смалявічах, Сенне, Заслаўлі, Бяльніцах, Асіпавічах, Уваравічах, Ветцы і інш. Безумоўна, падобныя адносіны да фінансавай работы з боку раённых, партыйных і савецкіх кіруючых арганізацый зьяўляюцца непадпушчальнымі і ні ў якім разе не павінны мець месца ў далейшым.

Перад фінансавай сыстэмай стаяць зараз надзвычай адказныя палітычна-важнасьці задачы. Да 20 верасьня выканаць фінплян III кварталу. Забясьпечыць ня толькі колькасныя, але і якасныя паказальнікі па ўсіх пляцяжох. Вось канкрэтная праграма фінансавай работы сёньняшняга дня. Цэ выпрацаваньне гэтай праграмы павінна быць накіравана ўвага раённых камітэтаў партыі, райвыканкомаў, партыйных ячэек, сельскіх саветаў, дэпутацкіх груп і ўсяго фінансавага актыву. Толькі пры такой работе БССР даб'ецца датэрміновага выкананьня фінпляну і выйдзе ў першы рады барацьбітоў на фінансавым фронце сярод Саюзных рэспублік.

Кандыдаты на ўсесаюзную чырвоную дошку ўдарнікаў фінфронту

Асьвейскі раён плян мабілізацыі сродкаў на 1 верасьня выканаў на 31,1 проц., плян даходаў з аграмаджанага сэктару на 92,8 проц.; сакратар РК СЬЦЕФАНОВІЧ, старшыня РВК ШКАДАРЭВІЧ, загадчык райфа КУЛІКАЎ.

ЗАСЛАЎСКІ РАЁН адпаведна — 79,5 і 88,9 проц.; сакратар РК БЕЛАШЭЎСКІ, старшыня РВК ПАШВЕНЧУК, заг. райфа ЛУФЕРАЎ.

СМАЛЯВІЦКІ РАЁН: 76,2 і 97,6 проц.; сакратар РК КУДМАН, старшыня РВК КАЗІНЦОЎ, заг. райфа РУБЕНЧЫК.

ЗАНОСЯЦЦА ДАДАТКОВА:

СЛУЦКІ РАЁН: 74,0 і 76,0 проц.; сакратар РК КРАЦЭР, старшыня РВК КНЯЗЕЎ, заг. райфа ЗАЛЕСКІ.

ЧАВУСКІ РАЁН: 72,8 і 64,0 проц.; сакратар РК БЯГУН, старшыня РВК ГАЎРЫКАЎ, заг. райфа СКАРАХОД.

МЕНСКІ РАЁН, ЯКІ ЗДАЎ ТЭМПЫ, З КАНДЫДАТАЎ НА ЎСЕСАЮЗНУЮ ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ ЗЬНІМАЕЦЦА.

ЧОРНАЯ ДОШКА

зрыўшчыкаў выкананьня фінансавага пляну

БЫХАЎСКІ РАЁН — выканаў плян мабілізацыі сродкаў на 1 верасьня на 37,1 проц. і даходаў з аграмаджанага сэктару на 51,8 проц. Сакратар РК РЭЗЬНІКАЎ, старшыня РВК ГРЫНЬКЕВІЧ, заг. райфа ТОРБІК.

ЦЕРАХАЎСКІ РАЁН адпаведна: 36,1 і 25,0 проц. Сакратар РК РАМАНЕНКА, старшыня РВК ДУПАНАЎ, заг. райфа КАРНЕЙЧЫК.

ЛОЕЎСКІ РАЁН — 25,6 і 53,7 проц. Сакратар РК ТРУС, старшыня РВК АСМАЛОЎСКІ, заг. райфа ІВАНОЎ.

ЧЭРЫКАЎСКІ РАЁН — 41,9 і 70,7 проц. Сакратар РК КАЦ, старшыня РВК РАТАЙКА, заг. райфа ТОКІН.

КАРМЯНСКІ РАЁН — 27,7 і 38,0 проц. Сакратар РК САЛАДУХІН, старшыня РВК КІН, заг. райфа ГОЛУБЕЎ.

ЧАШНІЦКІ РАЁН — 29,5 і 66,9 проц. Сакратар РК ІЎРЫ, старшыня РВК ПАПОЎ, заг. райфа ХІЛЬКЕВІЧ.

БЕШАНКОВІЦКІ РАЁН — 34,9 і 25 проц. Сакратар РК КАЖДАН, старшыня РВК ШАХ, заг. райфа ШАБОЛТАЎ.

ПРАПОЙСКІ РАЁН — 31,1 і 60 проц. Сакратар РК ПАПОВІЧ, старшыня РВК ЦЭНЦЫПЭР, заг. райфа ЖВІЦІН.

ДАДАТКОВА ЗАНОСЯЦЦА НА ЧОРНУЮ ДОШКУ:

УВАРАВІЦКІ РАЁН, які выканаў плян мабілізацыі сродкаў на 27,5 проц. і па даходах з аграмаджанага сэктару на 39,0 проц. Сакратар РК ФРЫДМАН, старшыня РВК КАРАЛЕНКА, заг. райфа БУРАКОЎ.

СУРАСКІ РАЁН — 27,5 і 27,8 проц. Сакратар РК АЎДЗЕЙЧЫКАЎ, старшыня РВК РУСАК, заг. райфа МАНЮКІ.

Аб рэарганізацыі горацкіх сельска-гаспадарчых вышэйшых навучальных устаноў і арганізацыі на іх базе адзінага сельска-гаспадарчага інстытуту

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

У адпаведнасьці з пастановай ЦВК СССР за 19 верасьня 1932 г. аб вышэйшай школе, Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Рэарганізаваць усе горацкія сельска-гаспадарчыя вышэйшыя навучальныя ўстановы і арганізаваць на іх базе адзіны сельска-гаспадарчы інстытут у складзе наступных факультэтаў:

а) буйнай рагатай жывёлы;

б) расьлінаводзтва з аддзяленьнямі—тэхнікі і арганізацыі ільнаводна-капаніпляводна-жывёлагадоўчых гаспадарак, тэхнікі і арганізацыі збожжавых гаспадарак і кормаздабываньня;

в) аграхэміі і глебазнаўства;

г) арганізацыі сельска-гаспадарчай тэрыторыі з аддзяленьнем геадэзычным;

д) эканомікі і плянаваньня сельска-гаспадарчай вытворчасьці і тэхнічнага нармаваньня.

2. Існуючае пры політэхнічным інстытуце геадэзычнае аддзяленьне перадаць у склад сельска-гаспадарчага інстытуту.

3. Тэрмін навучаньня на факультэтах: буйной рагатай жывёлы, расьлінаводзтва, аграхэміі і глебазнаўства, арганізацыі сельска-гаспадарчай тэрыторыі ўстанавіць у 4 гады і 2-4 месяцы, а на факультэце эканомікі і плянаваньня сельска-гаспадарчай вытворчасьці і тэхнічнага нармаваньня —5 год.

4. Даручыць дырэктару сельска-гаспадарчага інстытуту т. Барысевічу падаць гэтую структуру на зацьвярджэньне камітэту па вышэйшай тэхнічнай школе пры ЦВК СССР.

5. Даручыць НКземляробства канчаткова зацьвердзіць профілі рыхтуемых сельска-гаспадарчым інстытутам спэцыялістаў выходзячы з неабходнасьці падрыхтоўкі спэцыялістаў для сельскай гаспадаркі, якія апроч сваёй асноўнай спэцыяльнасьці мелі-б мінімум ведаў на сумежных спэцыяльнасьцях, якія адносяцца да сельскай гаспадаркі і неадпушчэньне вузкай тэхнічнай спэцыялізацыі і разталіпаваньня паасобных спэцыяльнасьцяй на часткі, а таксама недапушчэньне залішняй політэхнізацыі.

6. Прапанаваць дырэктару сельска-гаспадарчага інстытуту кантынгенты геадэзычнага аддзяленьня факультэту, арганізацыі сельска-гаспадарчай тэрыторыі ўзгадніць з упаўнаважаным НК цяжкай прамысловасьці.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

НАЗЫВАЕЦЦА РЭАЛІЗАВАЛІ

Выкананьне фінансавага пляну III кварталу па **Смалявіцкаму** раёну праходзіць надзвычай дрэнна. На 25-га жніўня замест 80 проц. заданьне выканана толькі на 51 проц.

Асноўныя прычыны зрыву ў злачынных адносінах асобных сельсаветаў да справы мабілізацыі сродкаў, у адсутнасьці належнай апэрацыйнай работы з боку фінорганаў (райфа, апчадкасы, банк), якія не забясьпечылі належнага кіраўніцтва работы сельскіх саветаў.

На раду сельсаветаў тэмпы работы невыстарчальныя. Варатоўскі сельсавет выканаў заданьне ўсяго на 32 проц., Вярхнянскі на 37 проц., Кляніцкі на 35 проц. Гэтыя сельсаветы правальваюць мабілізацыю сродкаў на працягу ўсяго году, а раённыя арганізацыі ня прымаюць мер да наладжваньня ў іх работы.

Зусім дрэнна праходзіць паступленьне грошай па падпісцы на пазыку другой пяцігодкі і ўкладах у апчадныя касы, заданьне па якіх выканана ўсяго на 20 проц. У некаторых сельсаветах ад падпіскі на пазыку калгаснікаў не паступіла ні аднэй капейкі. Да такіх сельсаветаў адносяцца Непраковіцкі Вярхнянскі і Забалоцкі сельсаветы.

Некаторыя сельсаветы раней давалі зводкі аб рэалізацыі пазыкі ў сумах куды большых, чым у сапраўднасьці маецца падпіскі. Павестках Жодзінскага сельсавету, напрыклад, па рабочых і служачых падпіска складала 52 тысячы рублёў, пры праверцы-ж аказалася толькі 48 тыс. руб. Узносаў на падпіскі па пазыкі ў сельсавету паступіла 15 тыс. руб., а па касе ўсяго 10 тыс. руб. Мала гэтага, Забалоцкі сельсавет зусім ня ведае колькі ў яго было рэалізавана пазыкі 4-га заключнага. З гэтай прычыны ім і да гэтага часу не раздадзены падпісчыкам аблігацыі гэтай пазыкі.

Такое становішча абсалютна недапушчальна ў далейшым. Ганебны провал у выкананьні фінпляну, як і абавязковых, так і па добраахвотных пляцяжох павінен быць ліквідаваны. Сталучыўшы выкананьне фінпляну з уборкай і збожжазадачай, а таксама сяўбой азімых, даючы жорсткі адпор «очковтирателям» і апартуністам, якія недаацэньваюць значэньня своечасовага выкананьня фінпляну, не дазволіць забясьпечыць выкананьне заданьня ў самы кароткі тэрмін з тым, каб заваяваць месца на ўсесаюзнай чырвонай дошцы.

В. Кудзін.

У фашысцкай Германіі

Арышты і вобыскі па ўсёй Германіі

БЭРЛІН, 4 (Белта). У МАНГЕЙМЕ арыштавана 55 чал., у шматлікіх іншых месцах у часе вобыску знойдзена камуністычная літаратура. Згодна сьцьвярджэньня газэты «ФЮРЭЛЬ», арыштаваныя нібыта былі ў саюзе чырвоных франтавікоў. Камуністычныя газэты і лістоўкі выяўлены таксама ва многіх месцах у правінцыі БАДЭН. Пакеты з камуністычнымі газэтамі былі знойдзены ў вагонах з вугалем, прыбыўшым з Саарскай вобласьці. У ДУІЗБУРГ—ГАМБОРНЕ праведзена аблава, у часе якой арыштавана 87 чал. і нібыта знойдзена шмат камуністычнай літаратуры.

ЗАКЛЮЧНАЯ ПРАМОВА ГІТЛЕРА НА ЗЬЕЗЬДЗЕ НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСТАЎ

БЭРЛІН, 4 (Белта). На апошнім пасяджэньні нацыянал-сацыялісцкага зьезду ў Нюрэнбэргу ГІТЛЕР сказаў заключную прамову, у якой прывёў «тэорыю няроўнасьці рас» у адпаведнасьці з напісаным у яго кнізе «Мая барацьба». «Абрана раса», у даным выпадку германская раса, паводле слоў Гітлера, прадуказана панаваньне над ніжэйшымі расамі».

Выходзячы з гэтых-жа прадпасылак, Гітлер падкрэсьліў, што нацыянал-сацыялісты абараняюць прыватную ўласнасьць і лічаць неабходным, каб на чале дзяржавы стаяла «іерархія правадыроў», якая зьяўляецца адзінай, «дзяржава-стваральнай» часткай народу.

Выходзячы з сваёй «расавай тэорыі», Гітлер далей гаварыў аб «місіі Германіі» у барацьбе супроць бальшавізму. Гітлер заявіў: «Калі мы турбуемся аб даверанай нам пясам крыві ўласнай расы, мы найлепшым чынам дапамагаем іншым народам ахоўваць сябе ад хвароб, якія пераходзяць ад расы да расы, ад народу да народу. Калі яніебудзь народ Заходняй ці Сярэдняй Эўропы ахапляецца бальшавізмам, гэта атрута будзе пашырацца і будзе спусташыць старэйшую і найпрыгажэйшую культуру зямлі кулі. Калі Германія ўзяла на сябе гэтую барацьбу, яна толькі выконвае, як гэта было часта ў яе гісторыі, сапраўды эўрапэйскую місію».

У заключэньні зьезду адбыўся парад штурмавікоў, у якім прыняло ўдзел, згодна афіцыяльнай ацэнкі, 120 тыс. чал.

Новыя тэрарыстычныя акты нацыянал-сацыялістаў у Аўстрыі

ВЕНА, 4. (Белта). Нацыянал сацыялісты правялі ўчора пры дапамозе бомб узарваць стрэльбішча хеймверу ў ГААБЭНЕ (Ніжняя Аўстрыя). У тойжа дзень была кінута бомба ў будынак арыштнага дому ў ШТЭЙРЫ. Праведзен рад арыштаў.

Далейшая фашызацыя Данцыгу

Вобыскі ў членаў партыі нацыяналістаў

БЭРЛІН, 4. (БЕЛТА). Данцыгскія нацыянал-сацыялісты прыступаюць да праведзеньня прынцыпу «уніфікацыі». Гэтымі днямі ў многіх членаў партыі нацыяналістаў быў зроблен вобыск. Згодна апошніх паведамленьняў з Данцыгу, у сярэдзіне верасьня адбудзецца канфэрэнцыя Данцыгскай арганізацыі партыі нацыянал-сацыялістаў. Адзінае пытаньне на павестцы дня — гэта пытаньне аб роспуску партыі нацыяналістаў, бо «зьмены палітычнай абстаноўкі ў Данцыгу робяць гэту меру мэтазгоднай». Адначасова і мэтады барацьбы супроць камунізму прыводзяцца ў адпаведнасьць з практыкуемымі ў Германіі. Гэтымі днямі ў Данцыгу былі арыштаваны 13 чалавек за падрыхтаваньне і распаўсюджваньне камуністычных лістовак. Учора арыштаваны яшчэ двое. Раскрыта нібыта нелегальная друкарня і знойдзена некалькі тысяч экземпляраў камуністычнай брашуры.

Ангельскі друк патрабуе павялічэньня морскіх узбраеньняў

ЛЕНДАН, 4. (Белта). «Морнінг пост» услед за «Дэйлі тэлеграф» патрабуе павялічэньня брытанскага флёту з прычыны правядзёных праграм ваенна-морскага будаўніцтва ПАЗШ і Японіі. Закранаючы перспэктывы 1935 г. (тэрміну скасаваньня лёнданскага морскага дагавору) «Морнінг пост» аўтарытэтна заўважае: «Можна не сумлявацца, што 1935 год будзе адзначан альбо разрывам дагавору, альбо іх пераглядам на ўмовах патрабаваньняў некаторых дзяржаў».

Дадатковыя парляманцкія выбары ў Англіі

ЛЁНДАН, 3 (Белта). На дадатковых парляманцкіх выбарах у Клей-Кросе Гендэрсон атрымаў 21.931 голас, кандыдат кампартыі Політ—3.434 і ўрадавы кандыдат Мурс—6.293. У часе перадвыборчай кампаніі агенты Мурса ўстрымліваліся ад актыўнай барацьбы супроць Гендэрсона і ў першую чаргу садзейнічалі яго барацьбе супроць кандыдата Політа.

Англа-японская эканамічная вайна ў разгары

ТОКІО, 4 (Белта). Камэнтуючы маючую быць 22 верасьня ў Сімле (Індыя) канфэрэнцыю аб аднаўленьні гандлёвага дагавору паміж Індыяй і Японіяй, міністар замежных спраў Уцыда заявіў, што Японія катэгарычна супроць брытанскіх прапаноў адносна заключэньня згоды аб размеркаваньні японскіх і брытанскіх тавараў на сусьветным рынку.

Японія,—заявіў Уцыда, па-ранейшаму настойвае, што згода можа датычыць толькі брытанскіх калёній, але ня ўсіх тэрыторый Вялікабрытаніі. Паводле слоў Уцыда, Японія ня згодзіцца пачаць канкрэтныя перагаворы з Англіяй, пакуль апошняя не пераглядзіць сваёй першапачатковай прапановы.

ЛЕГЕНДА АБ „ТАЙНАЙ ЗГОДЗЕ" Ў ПРЫМОР'І

ТОКІО, 2 (Белта). Рад японскіх газэт публікуе на вёрным месцы паведамленьне «СЫМБУН РЭНГО» з Чанчуня аб прямое савецкай палітыкі на Далёкім Усходзе». Спасылаючыся на аўтарытэтныя колы, «Сымбун Рэнго» сьцьвярджае, што савецкі ўрад пераглядзе нібыта перайсьці «да ажыцьцяўленьня актыўнай палітыкі на Далёкім Усходзе ў адносінах да Манчжоу-Го, Японіі і Кітаю». Гэта «Актыўная» палітыка будзе нібыта заключацца ў процідзеяньні эканамічнаму і ваеннаму разьвіцьцю Манчжоу-Го. Адначасова мяркуецца-моў прадаставіць «нейкай» кітайскіх гапітках у савецкім Прымор'і з мэтай процідзеі японскай агрэсіі. Паведамленьне заканчваецца сьцьвярджэньнем, што ў Харбіне пасьля раду нарад ужо падпісана «тайная згода» з амерыканскім консулам Хэксонам аб перадачы амерыканцам правоў на горныя і пясныя распрацоўкі ў Прымор'і.

Абмен ратыфікацыйных грамат згоды паміж СССР і Польшчай

ВАРШАВА, 4 (Белта). 4-га верасьня ў міністэрстве замежных спраў адбыўся абмен ратыфікацыйнымі граматамі «згоды аб прававых адносінах на дзяржаўнай граніцы», падпісанай у Маскве, у красавіку 1932 году. З польскага боку прысутнічалі: міністар замежных спраў БЭК, нач. дагаворнага аддзелу міністэрства замежных спраў праф. МАКОЎСКІ, з савецкага боку: паверанны ў справах СССР у Польшчы т. ПАДОЛЬСКІ і першы сакратар паўнамоцнага прадстаўніцтва т. НІКАЛАЕЎ.

Прабываньне Эрыо ў Маскве

Прыём у старшыні ЦВК СССР т. Калініна

МАСКВА, 4 (Белта). Старшыня ЦВК СССР т. Калінін прыняў Эрыо і французкага пасла Альфана. Гутарка цягнулася 1 г. 10 мінут.

***

МАСКВА, 4 (Белта). 4-га верасьня Эрыо наведаў выстаўку мастацтва мастакоў РСФСР за 15 год. Тлумачэньні даваў мастацтвазнаўца Эфрос. У той-жа дзень Эрыо агледзеў 25-ю школу імя Ленінградскага АНА і ўзорную школу імя Кагановіча ў Філях. Эрыо вельмі цікавіўся пастаноўкай школьнай справы, школьнымі праграмамі, арганізацыяй народнай асьветы, школьным заканадаўствам РСФСР, падрабязна распытваў аб усіх дэталях навучаньня ў савецкіх школах, наведаў клясы, сталярную, сьлесарную і такарную майстэрні і сталовую, дзе дзецям гатавалася сытнае здаровае сьнеданьне. У 25-й школе Эдуард Эрыо зрабіў запіс у школьным журнале, дзе выказаў сваё захапленьне пастаноўкай школьнай справы ў СССР.

„Польшча мусіць абараняць доступ да мора"

Заява старасты „сьвята ўраджаю"

ВАРШАВА, 4. (Белта). У Спале (летняй рэзыдэнцыі прэзыдэнта) адбылася традыцыйная ўрачыстасьці з прычыны сьвята ўраджаю. Прыбыла з усіх польскіх ваяводзтваў каля 20 тыс. чалавек. Узначальвала сьвята дэлегацыя Памор'я. Старастай быў назначэн Кашуб (жыхар памор'я).

У слове ў гонар прэзыдэнта староста запэўніў яго ад імя кашубаў, што яны «гатовы да апошняй каплі крыві абараняць доступ Польшчы да мора». «Калі неабходна будзе пайсьці да Штэтына і Кольбарга,— заявіў староста, — дык усё-ж гэта будуць землі, населеныя з прадзеку польскімі племенамі. Мы ня прынялі-б і тады ніякага грэху на сябе, бо вызвалілі-б толькі сваіх братоў ад рабства».

Аўстрыйская сацыял-дэмакратыя прапануе Дольфусу свае паслугі

ВЕНА, 4 (БЕЛТА. На адкрыцьці асеньняга кірмашу венскі бургамістар с.-д. ЗЭЙЦ выступіў з прамовай, у якой прапанаваў урэду Дольфуса склікаць асеньнюю сэсію парляманту, які быў вясной аб'яўлен урэдам «непрацаздольным». «Сацыял-дэмакратычная партыя, — заявіў Зэйц,—гатова актыўна супрацоўнічаць з урадам».

Дольфус, а таксама кіраўнік Ніжняаўстрыйскага правінцыяльнага ўраду Рэйтэр у той жа дзень на мітынзе хрысьціянскай сацыяльнай партыі нэтэарычна адхілілі прапановы сацыял-дэмакратаў. Дольфус заявіў, што ўрад пічыць неабходным перабудаваць аўстрыйскую дзяржаву на карпартатыўных прынцыпах «для знішчэньня марксызму і клясавай барацьбы». Рэйтэр пад крэсьліў, што палітычная абстаноўка патрабуе доўгага ўстараненьня парляманту.

У палітычных колах сьцьвярджаюць упэўненасьць, што адпор, даны ўрадам сацыял-дэмакратам, ня будзе ім перашкаджаць падтрымліваць урад Дольфуса.

„Заробкі" лідэраў германскага фашызму

«Дзенькік Віленскі» зьмяшчае характэрную заметку аб даходах гітлераўскіх бэндзаў.

«У той час, — піша газэта, — як шырокія пласты працоўнага насельніцтва церпяць голад, калі становішча рабочых не палепшылася ні на ёту, адзін пласт насельніцтва Германіі значна палепшыў сваё жыцьцё. Тэтым пластом зьяўляюцца гэтак званыя гітлераўскія бэндзы, даходы якіх абрасьліваюцца тысячамі марак.

Праўда, сам Гітлер адмовіўся ад пэнсіі канцлера, але падлічана, што загад Гэрынга аб абавязковым абмыцьці ўсімі дзяржаўнымі і камунальнымі ўстановамі кніжкі Гітлера «Майна-кампф» («Мая барацьба») дае яму даход больш, чым дзесяцігадовая пэнсія канцлера.

Меншыя фігуркі таксама ня маюць чаго нарэкаць. Так, напрыклад, надпрэзыдэнт Сылезіі Брукнэр атрымлівае ў месяц 5660 марак, а прэзыдэнт паліцыі ў Брэсьлаўлі Гейнэ — 7620 марак».

У той час, як лідэры фашызму апладзіруюць у ладоні, гітлераўскі ўрад скасоўвае ўсялякія дапамогі беспрацоўным і зьніжае і без таго жабрацкую зарплату ўсіх працоўных рабочых.

ЗАБАСТОВАЧНАЯ БАРАЦЬБА ІНДЫЙСКІХ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ

Міжнародны Камітэт рабочых тэкстыльшчыкаў апублікаваў падрабязны даклад аб становішчы тэкстыльшчыкаў у Індыі.

У Бамбэі за апошнія 2 месяцы былі звольнены 16.000 рабочых. Мерамі рацыяналізацыі дасягнута далейшае скарачэньне зарплаты на 20-30 проц. У Амедабадзе саюз фабрыкантаў абвясьціў рабочым аб прадстаячым на ўсіх фабрыках скарачэньні зарплаты на 12 проц. У Бірамгаме зарплата ўжо зьніжана на 35 проц. У Нэйпуры прадстаіць скарачэньне зарплаты на 20 проц. У Аколе пазбаўлены работы 5.000 чалавек. І тое-ж самае адбываецца ва ўсіх іншых цэнтрах тэкстыльнай прамысловасьці краіны.

Гэта новае наступленьне на жыцьцёвыя ўмовы рабочых адгуквае на голад сотні тысяч працоўных і іх сем'яў. Нічога дзіўнага, што ў адказ на «рацыяналізацыю», на новыя масавыя звальненьні, на скарачэньне зарплаты тэкстыльшчыкі абвясьцілі ня-мірыцкую барацьбу супроць сваіх прыгнятальнікаў. Забастовачная хваля захапіла дзесяткі фабрык у Бамбэі, Амедабадзе, Коінпуры, Бавнагоры, Джалгаўне, Бірамаўне, Барода, Броджы, Гамбой, Лукуне і інш. Забастоўкі ў большасьці носяць разрознены характар, але сярод рабочых мас расьце воля да барацьбы, да адзінага фронту. У Бамбэі штодзённа адбываюцца мітынгі, на якіх рабочыя патрабуюць абвяшчэньня ўсеагульнай забастоўкі. Арганізаская на аснове адзінага фронту забастоўчы камітэт, у які ўваходзяць прадстаўнікі фабрычных рабочых. Дзень і мая ў гэтым годзе прайшоў у Бамбэі пад лёзунгам падрыхтоўкі да ўсеагульнай забастоўкі. Рабочыя іншых баваўляных цэнтраў таксама адносяцца спачувальна да ідэі ўсеагульнай забастоўкі. Забастоўка на фабрыцы Эльчыкі і Коімпур паражала ператварыцца ва ўсеагульную забастоўку рабочых усяго горада, што было адхілена ўмяшаньнем паліцыі. Асаблівы характэрным зьяўляецца ўзмацненьне забастовачнага руху ў Амедабадзе, які зьяўляўся дагэтуль, па словах Гандзі, «пячасьлівым оазісам у моры клясавага антаганізму ў Індыі». Рабочыя Амедабаду ўсё больш і больш вызваляюцца з-пад уплыву Гандзі. У 1933 г. у гэтым горадзе, ня кажучы на апазыцыю саюзу рабочых-гандзістаў, адбылося 14 забастовак. Цяпер там бастуюць рабочыя трох тэкстыльных фабрык.

Хваля забастовак праходзіць па ўсёй краіне, ня гледзячы на белы тэрор, якім урад стараецца зламаць супраціўленьне рабочых новаму наступленьню капіталістаў.

Загад Народнага Камісарыяту шляхоў зносін ад 4 верасьня 1933 г.

Аб скажэньнях рашэньняў ЦК і СНК, дапушчаных ў згодзе НКШЗ і ЦК чыгуначнікаў аб аплаце цягніковых змазчыкаў ад 19 ліпеня 1933 г.

Праведзеная, згодна паведамленьня начальніка паліткаддзелу Паўночных чыгунак т. Варапаева, праверка заключанай НКШЗ і ЦК чыгуначнікаў аб аплаце цягніковых змазчыкоў (за подпісам б. нач. цягі НКШЗ т. Калашнікава і ад ЦК чыгуначнікаў т. Грыгор'ева) устанавіла, што ва ўказанай згодзе скажон цэлы рад важнейшых указаньняў ЦК і СНК, а іменна:

1. Замест устаноўленай рашэньнем ЦК і СНК адзінай месячнай тарыфнай пакілёмэтравай стаўкі для змазчыкаў першага разраду 170 руб. і другога разраду 140 руб. згодай самавольна гэта адзіная стаўка разьбіта на дзьве — тарыфную і кілёмэтравую.

2. Начальніку вагоннага кіраўніцтва т. Арнольдаву ў 5-дзённы тэрмін прадставіць мне новы праект згоды з ЦК чыгуначнікаў, які-б поўнасьцю адпавядаў рашэньням ЦК і СНК ад 8-га ліпеня 1933 г.

3. Падпісаўшаму ад імя НКШЗ згоду ад 19 ліпеня б. нач. кіраўніцтва цягі НКШЗ т. Калашнікаву абвяшчаю суровую вымову.

4. Прымаўшым удзел у складаньні ўказанага праекту згоды б. нам. нач. кіраўніцтва працы т. Гудко і старэйшаму інжынеру-эканамісту кіраўніцтва працы Кібалаву абвяшчаю суровую вымову з папярэджаньнем.

Народны Камісар шляхоў зносін А. АНДРЭЕЎ.

Нач. Паліткіраўніцтва НКШЗ ПАЛОНСКІ.

Узгоднена: Старшыня ЦК чыгуначнікаў ЦІХАН.

Усебеларускі зьлёт

КАЛГАСНЫХ КОНЮХАЎ-УДАРНІКАЎ АДКРЫВАЕЦЦА СЁНЬНЯ, У 6 ГАДЗ. ВЕЧ., У ПАМЯШКАНЬНІ ДОМУ КАМАСЬВЕТЫ (РОГ ВУЛІЦ ЭНГЕЛЬСА І К. МАРКСА).

АРГКАМІСІЯ.

ЭСКАДРЫЛЬЮ імя КАГАНОВІЧА

На бягучым рахунку—706.296 руб.

За 5 верасьня па бягучы рахунак паступіла ад арганізацый і ўстаноў гораду Менску толькі 876 руб.

Паступіла з раёнаў: з Мазырскага —3.012 руб., Петрыкоўскага—738 руб., Пухавіцкага—4.092 руб., Старобінскага—741 руб., Рэчыцкага — 300 руб., Шклоўскага—591 руб., Бярэзінскага — 960 руб., Бягомльскага—492 руб., Будакашалёўскага —1.014 руб., Заслаўскага—371 руб., Крычаўскага—2.782 руб. і Магілеўскага—23 руб. Усяго за дзень паступіла 16.807 руб.

З пачатку збору на рахунку 706.296 руб.

Уносяць і выклікаюць

Уносім на пабудову эскадрыльлі імя тав. КАГАНОВІЧА: ГАЛАДЗЕД —50 руб., БЭНЭК—50 руб., ХАЦКЕВІЧ—50 руб., ГРЫСЕВІЧ—50 руб., КОНІК—50 руб., ЖОЛУДАЎ—50 руб., ФЛЕКСЕР—50 руб., Ляхаў 25 р., ЧЭРНЫЙ—25 руб., ПЯТРОВІЧ—25 руб., СІЛІВЕСТРАЎ—25 руб., ГУРЭВІЧ—25 руб., ЧАРНУШЭВІЧ—25 руб., СТРАКОЎСКІ—25 руб., ДВАРЭЦКІ—25 руб. Усяго 550 руб. і ВЫКЛІКАЕМ:

Т. т. ШАРАНГОВІЧА, ЖАБРОЎСКАГА, РЫСЬКІНА, ІВАНОВА, ЛЫЧОВА, БРАГІНСКАГА, ДЗЕНІСКЕВІЧА, КАРТУКОВА, ПЫЖЫКАВА, ЛЯЎКОВА (ЦК КП(б)Б), АМБРАЖУНАСА, САКАЛЕНКА (НК ТП), КАЦА (НК ЛП), РОЗІНА (Наркамлес), СЬМІРНОВА (Наркамсаўгасаў), ДУНЦА, БАРАЎКОВІЧА (Наркамасьветы), СААКЯН (СНК), СТРЭЛЕ (Наркамзем), КАНДЫБОВІЧА (СНК), КУЗЬМІНА (Наркам'юст), КАВАЛЬЧУКА, ЛІСКОВІЧА (ЦСПСБ), ЖУКАВА (НККГ), ФЕЛЬДМАНА, ШЭРМАНА (Дзяржбанк), БУШУЕВА (Сацзембанк), ГАЎРУСЕВА (Каапбанк), КЕЙЛІНА (Прамбанк), РОЗЭНГАУЗА (Камунбанк), ГЕОГРАДЗЕ, КАРНАЧОВА (Наркамсгаб), ВАЛОДЗЬКА (Наркамсувязі), МАТУСЭВІЧА (Наркамсабез), ЗАКОЎСКАГА, ШАРАВА—(ДПУ), ГОРЫНА, ДОМБАЛЯ (БАН).

Аўтакалёна заводу імя Сталіна ў Гомелі

ГОМЕЛЬ, 5. (Па тэлефону ад нашага спэцкора).

3 верасьня а 4 гадз. дня з Масквы выехала аўтакалёна заводу імя Сталіна па маршруце Масква—Гомель, — Кіеў—Днепрапятроўск — Харкаў — Ароп — Тула—Масква. У прабегу прымае ўдзел 12 аўтамашын, з іх 4 нова-канструяваныя заводам 6-калёсныя машыны АМО-5 і 4 машыны АМО-6.

Узначальвае калёну галоўны інжынэр заводу тав. Лялін. Усяго на машынах 36 чалавек, лепшых ударнікаў першага ў СССР аўтабудаўнічага гіганту.

Мэта прабегу — выпрабаваньне тэхнічных і эксплёватацыйных якасьцяй новых 6-калёсных машын.

Сёньня а 5-й гадзіне дня аўтакалёна прыбыла ў Гомель. Аўтадорожная арганізацыя Гомелю, прадстаўнікі гарсавету, гаркому, прафсаюзных арганізацый сустракалі калёну за 13 кілёмэтраў ад гораду, у Касьцюкоўцы, дзе з удзелам рабочых шклобуду і калгасьнікаў праведзен мітынг, прысьвечаны ўрачыстаму спатканьню ўдзельнікаў прабегу.

Удзельнікаў прабегу, а ў асобе іх і ўвесь калектыў заводу імя Сталіна, горача вітаў рабочы шклобуду тав. РАДЗЬКО, калгасьнік калгасу «Інтэрнацыянал» тав. ПІНЧУК і старшыня Аўтаадору БССР тав. КОРФ.

Тав. ЧАРКАСАЎ — прадстаўнік партколектыву заводу імя Сталіна вітаў рабочых Гомельшчыны ад імя 4-тысячнай партарганізацыі і 22-тысячнага рабочага калектыву заводу. Тав Чаркасаў расказаў аб энтузіязьме рабочых у барацьбе за разьвіцьцё аўтамабільнай прамысловасьці, у барацьбе за аўладаньне тэхнікай.

Начальнік калёны тав. ЛЯЛІН у сваім выступленьні адзначыў, што за пройдзены калёнаю шлях ніякіх дэфэктаў ня было, што дае ўпэўненасьць у далейшых посьпехах прабегу, а таксама посьпехах заводу па рэканструкцыі машын. Тав. Лялін заканчвае словамі:

— Інжынэрна-тэхнічны персанал і ўвесь рабочы калектыў заводу напружвае і будзе напружваць усе свае сілы, каб савецкія машыны былі лепшымі машынамі, чым замежныя, каб завод апраўдаў ганарэвую назву, якую ён носіць—імя правадыра сусьветнага пралетарыяту тав. Сталіна.

Л. Ів.

Фізкультурныя спаборніцтвы па прыз „Зьвязды"

Сёньня на ўсебеларускім стадыёне будуць адбывацца міжведамственныя фізкультурныя спаборніцтвы на прыз газэты «Зьвязда».

Спаборніцтвы пачнуцца бегам на 100 мэтраў, пасьля чаго праводзяцца: мятаньне дыску, штурханьне ядра, скачкі ў вышыню з разьбегу і швідкія эстафэты—мужчынскія і жаночыя.

Прымаюць удзел каманды «Дынамо» і прафсаюзаў.

У канцы дня — футбольны матч Менск-«Дынамо» з камандай «Дынамо» Смаленску.

7 верасьня будуць праведзены спаборніцтвы на астатніх відах лёгкай атлетыкі і першы ў БССР футбольны матч дзіцячых каманд Ворша—Менск.

Розыгрыш па баскетболу, валейболу і стральбе—8 верасьня.

Аб працягненьні тэрміну перарэгістрацыі зброі

Пастанова СНК БССР

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе: працягнуць тэрмін перарэгістрацыі зброі да 10-га верасьня 1933 г.

Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік спраў СНК і Эканаса БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

Уздым вады на р. Сьвіслачы

5 верасьня рака Сьвіслач выйшла з берагоў. У Менску ўздым вады заўважан а 6-й гадзіне раніцы. Да 4 гадзін дня ўзровень вады павышан на 206 сантымэтраў. З 4 да 7 гадз. вечара вада ня прыбывала.

Вада перайшла праз Савецкую вуліцу. Трамвайны рух першай, трэцяй і пятай ліній спынены. Будынкі фабрыкі імя 8 сакавіка затоплены, сад «Прафінтэрн» і цырк — таксама.

Менгаркомам КП(б)Б і гарсаветам яшчэ з раніцы быў створан штаб па барацьбе з паводкай. Мабілізавана пяць грузавых аўтамашын і некалькі фурманак. У арганізацыі дапамогі фабрыцы імя 8 сакавіка, электрастанцыі, дзяржцырку і мясоваму прыбярэжнаму насельніцтву прынялі актыўны ўдзел міліцыя, пажарная каманда, рабочыя электрастанцыі і прыгарадняга саўгасу (звыш 250 чалавек).

Усе матар'ялы і абсталяваньне фабрыкі імя 8 сакавіка падняты. Маемасьць дзяржцырку выратавана. Да электрастанцыі вада не дапушчана (зроблена загарожа, насып і інш.). Электрастанцыя працуе бесьперабойна.

Намесьнік старшыні гарсавету тав. Бімбарт у гутарцы з нашай брыгадай паведаміў, што штабам адначасова прынята рад канкрэтных мер для таго, каб узмацніць барацьбу з паводкай, каб прыняць неадкладныя меры па ахове і завозцы ўраджаю на ўзьбярэжжах ракі Сьвіслачы.

С—оў і Гарлеўскі.

Паведамленьні

У сувязі з тым, што выхадны дзень па ўсіх установах г. Менску перанесен на 7-IX, адзіны партдзень па пытаньні аб палітвучобе, прызначаны на 7-IX, перанесен на 8-IX.

КУЛЬТПРОП ГК КП(б)Б.

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што з 12-13-IX г. г. у г. Барысаве будзе працаваць ПК ЦКК КП(б)Б па разгляду партпрэтэнзій Бягомльскага і Бярэзінскага раёнаў.

Намі выклікаюцца наступныя т. т. па Бярэзінскім раёне, на 13-IX: Нехай М. С., Давідовіч Д. З., Віндорчык В. А., Сермяшка В. М., Зінтман М. А., Галіеўскі В. М., Марковіч Ц. А., Ключ Я., Волкаў М. Б., Янкоўскі Б. М., Фабрыценка Н. А., Дзянісаў В. Н., Шушко Б. Д., Крумкач Г. С., Бельскі В. І., Клівота Р. А., Дудкін П. М.

Сьпіс партсправаў, прызначаных на ПК ЦКК па Бягомльскім раёне ў г. Барысаве, на 12-IX—33 г.: Кургай І. І., Коялоўскі М. Б., Хоміч М. Ю., Цімахоў Я. Я., Сташкевіч А. І., Кабак Я. М., Булахер М. Т., Лазар Ю. З., Поляк А. М., Герасімчык Р. А., Сінякоў К. А., Шлейфер С. Д., Забалоцкі Ю., Гельфанд А., Юркевіч Р. П., Вашкевіч Я. Я., Бардзік А. Ю., Дзямідовіч С. А., Сялюк П. К., Лукашэвіч І. С., Лях А. Я., Вакумнін Я. Ф., Раленка І. К., Пеляцкоф П. Р., Ражаноў М.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ДЗЯРЖЦЫРК Гарадскі сад
пачатак у 8 с пал. гадз. веч.
НОВАЯ АТРАКЦЫЁННАЯ ПРАГРАМА
Арыг. драс. МОРСКІЯ ЛЬВЫ Роза Ласка
ЛОС АМБАТОС паветр. палёт | ЛО І РЭКС акраб. парад.
АКРОЛЬ Крафт | ЮЛІАНС эквілібр. | ЭЛІАТ гімнаст.
ФАБРЫ кон. жанглеры | МОНТАНО паясьн. каўбоі
І яшчэ 10 нумароў
СЁНЬНЯ У 2 ГАДЗ. ДНЯ РАНІШНІК
прымае ўдзел уся трупа. Новая праграма

ГУКАВЫ кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" | Гукавы гістарычна мастацкі фільм КАРМЕЛЮК

КІНО „Пралетары" | Замежны трука-прыгодніцкі кіно раман Чалавек без нервоў у 7 частках.

Кіно Інтэрнацыянал | Замежны мастацкі фільм ВОЧЫ МЕРЦЬВЯКА Драма ў 6 частках

КІНО СПАРТАК | Ад 3 верасьня ўсходні мастацкі фільм ДЗНА ДЗА—ДЗУ Драма ў 7 частках

Дзіцячы гукавы кіно-тэатр | Прыгодніцкі кіно-фільм Дзіця дзяржцырку у 6 ЧАСТКАХ. Пачатак а 2 гадз. дня

У сувязі з тым, што некаторыя рабфакі, прымацаваныя да

ГОРАЦКАГА СЕЛЬСКА-ГАСПА ДАРЧАГА ІНСТЫТУТУ

ўтварэньня выпускі апошняга курсу к 1/X-33 г., а кантынгент набору на І курс ін-ту, згодна пастановы НКЗВ ад 13/VIII павялічваецца з 650 да 725 асоб, і што студэнты старэйшых курсаў прабудуць на ўборцы да 20/X-33 г., набор на І-шы курс працягваецца да 15/IX-33 г. Заняткі па ўсіх курсах факультэтах Інстытуту пачынаюцца з 1/X 33 г.

Студэнты, у якіх ёсьць літэры на праезд на чыгунцы павінны завярнуцца ў мясцовыя райАНА, або дасласць іх Інстытуту для прадаўжэньня сапраўднасьці.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Завочны універсытэт мастацтваў НКА РСФСР і ЦК ПРАЦ МАСТАЦТВА
АДКРЫТ ПРЫЁМ НА тэатральны факультэт.
Прымаюцца работнікі тэатру. Тэрмін навучаньня 2 г.
Адкрыта таксама падпіска на выданьне універсытэту. Праспэкт і ўмовы пад ліскі высылаюцца за 20 кап. дробн. паштов. марак.
Адрас: Масква, Цэнтр, Никольская 4, под'езд 1., заочный университет искусств НКП РСФСР и ЦК рабис.

Марына-Горскі садова-гародны тэхнікум,
які рыхтуе агранома плодовай і гароднай сярэдняй кваліфікацыі, абвяшчае дадатковы НАБОР студэнтаў у ліку 30-асоб на вячэрняе гароднае аддзяленьне без адрыву ад вытворчасьці. Таксама працягваецца прыём заяў на 1 курс дзённага плодовага і гароднага аддзяленьняў на дадатковыя групы. Прымаюцца асобы з ведамі ў абъёме семігодкі. Да заяў неабходна прыкласьці наступныя дакументы: зась ведчаную анкету, пасьведчаньне аб асьвеце, аб сац. матэр'яльн. становішчы, аб узросьце, аб стане здароўя. Прыём заяў і іспыты да 10 верасьня. Пачатак заняткаў для дадатковых груп з 10 верасьня. Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй, сталоўкай і інтэрнатам. Адрас, пашт. аддз. Марына-Горка, садова гародны тэхнікум.
ДЫРЭКЦЫЯ.

КУРСЫ ВОСУ
АРГАНІЗУЮЦЬ ГРУПУ
РАХУНКАВОДАЎ для рабённай СІСТЭМЫ
Белпромсавету. Стыпэндыя ад 40 да 90 руб. у месяц і кватэрныя 20 руб. Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца. Заявы з дакумантамі: аб сац. становішчы і паходжаньні, аб адукацыі (ня менш 6 г.), аб узросьце (ня менш 17 г.) і для калгасьнікаў згоду праўленьня на кіраваць у кандыдаты ВОСУ (г. Менск Камуністычная 16, пак. № 10) ад 9 да 12 гадз. дня. Заявы без дакумантаў разглядацца ня будуць. Прыём заяў да 23 верасьня г. г.

Высачанскі дашкольны тэхнікум
абвяшчае
дадатковы НАБОР студэнтаў
на першы курс. Прыём заяў да 20 верасьня. Да заявы і дакумантаў трэба прыкласьці дзьвае фотакарткі. Пімаюцца ці скончыўшыя семігодкі. Іспыты з 20 верасьня г. г. Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй ад 45—50 руб. у мес., сталовай і інтэрнатам. Заявы без дакумантаў не разглядаюцца.
Адрас: ст. Крынкі МБЖ чыг. п/а Высачанны Лёзьненскага раёну, дашкольны тэхнікум.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Гарком саюзу працасьветы закупіў пастаноўку
„ЧЫРВОНЫ МАК"
у Дзярж. тэатры для асьветнікаў гор. Менску на 6-е верасьня г. г. Скід ка для асьветнікаў 50 проц. прымаюцца калектыўныя заявы. Пачатак спэктакля у 9 гадзін веч.
Білеты ў ГК саюзу з 10 да 4-х гадз. дня а з 6 да 9 у касе тэатру.

ФІНАНСАВА-ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
Інстытуту народкай гаспадаркі
абвяшчае
ДАДАТКОВЫ НАБОР на адну дзённую групу
ПА ФІНАНСАВАНЬНЮ І КРЭДЫТАВАНЬНЮ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ
і дзьве вячэрнія групы па фінансаваньню і крэдытаваньню галін на родкай гаспадарцы.
Тэрмін падачы заяў да 15 верасьня 1933 г. Заявы з належнымі дакумантамі накіраваць па адрасу: Менск, Унівэрсытэцкі Гарадок, Галоўны Корпус, пакой № 203, Фінансава-Эканамічны Факультэт.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Шукаю брата Шашка Міколу Сьцяпанава, 18 год., сяродняга росту. Просьба паведаміць па адрасу: калгас „Культура", Пухавіцкага раёну, Шашку С. П.

Брагінскі дзяржаўны тэхнікум буйнай рагатай жывёлы
абвяшчае, што
ПРЫЁМ ЗАЯЎ
на 1 курс тэхнікуму працягнут да 10 верасьня. Да заявы патрэбна прыкласьці дакуманты ў арыгіналах, згодна існуючых правіл для паступленьня ў ВНУ і тэхнікумы. Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам, сталоўкай і пральняй. Тэхнікум рыхтуе спэцыялістаў сярэдняй кваліфікацыі па буйнай рагатай жывёле. Пачатак заняткаў 15 верасьня. Дакумэнты накіроўваць па адрасе: БССР м. Брагін жывёлагадоўчы тэхнікум.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ІНСТЫТУТ УДАСКАНАЛЕНЬНЯ ДАКТАРОЎ НКАЗ БССР
АБВЯШЧАЕ, ШТО
сёньня, у 8 гадзін веч., у памяшканьні клюбу мэдсан-працы адчыняюцца заняткі па Марксызму-Ленінізму для дактароў. Даклад тав. Топаза на тэму: Марксызм-Ленінізм.
Явка ўсіх дактароў абавязкова.

ЧЭРЫКАЎСКІ ВЭТТЭХНІКУМ
паведамляе, што НАБОР на 1 курс працягнут да 10 верасьня.
Заявы і дакумэнты накіроўваць па адрасу: г. Чэрыкаў, ветэхнікум.
ДЫРЭКЦЫЯ.

КУРСЫ ВОСУ
арганізую